Канстанцін Салавянюк ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Госці з Вільні ☞ 9-10

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 24 (2822) Год LV | Беласток, 13 чэрвеня 2010 г. | Цана 2,50 зл. (VAT 0%)

2011 перапіс насельніцтва

У Чыжоўскай гміне — сустрэча з айцом Маркам Якімюком

Ніва: — Ці ў Чыжах — вёсцы, у якой найбольш людзей у 2002 годзе запісалася беларусамі, адчуваецца беларускасць штодзень?

Айцец Марк Якімюк: — Так, каго не спытаеш, то табе адкажа, што ён беларус. „Чыжавяне" ці „Збучанкі" спяваюць перш за ўсё па-беларуску. Я таксама дзяцей рыхтаваў да беларускіх конкурсаў, а нават дзеля конкурсу адну „нашу" песню пераклаў на літаратурную беларускую мову.

— Але Вы з дзяцьмі таксама прымалі ўдзел ва ўкраінскіх конкурсах.

— Так. Думаю, што калі чалавек з'яўляецца беларусам, але адначасова ўмее разабрацца ў іншых культурах, то гэта сведчыць пра яго адкрытасць і духовае багацце, а перш за ўсё, што паважае другога чалавека і яго культуру. Нядаўна споўнілася 500 гадоў парафіі ў вёсцы Улюч, што ў Бяшчадах, і папрасілі мяне напісаць з гэтай нагоды верш па-ўкраінску, які адкрываў канферэнцыю. Пішу таксама вершы па-лэмкоўску, расейску, польску і, зразумела, па-беларуску.

— Растлумачце, адкуль у Вас валоданне гэтымі мовамі?

— Мой бацька зараз на парафіі ў Сямятычах, але я рос на Лэмковыне, дзе тады бацька меў парафію. У хаце гаварылася па-беларуску, але навокал я чуў і гаварыў па-лэмкоўску ці па-ўкраінску. Вельмі мне падабаецца, што лэмкі так трымаюцца сваёй мовы. Там няма, як у нас, што калі ўнучак прыязджае з Беластока да бабулі, то тая ломіць язык і „rozmawia po polskiemu". Можа ім дапамагло, што іх высялялі і таму зараз яны так моцна трымаюцца свайго. Аб'ядноўвае іх няшчасце. Але калі гаварыць пра мову, то нават такі анекдот ёсць. Паляк гаворыць да лэмка: — Паночку, перастанце гаварыць „лэм" („лэм" па-польску значыць „tylko"), то дам вам мільён злотых. А лэмко адказвае: — Лэм дайтэ. Вяртаючыся да нашай беларускасці, то не так даўно прыехала тут тэлебачанне і запісалі мяне наконт маіх вершаў ва ўкраінскую перадачу. Пару асоб пасля тэлефанавала пытаючы, калі я стаў украінцам, а я адказваў: не, я беларус, толькі калі ёсць зацікаўленне маёй паэзіяй, то не бачу прычыны, па якой меў бы я адмаўляцца ад удзелу ў праграме. Мне часам грае ў душы іншая чым беларуская мова, бо на такіх землях я выхоўваўся, але з хаты я вынес беларускую. Бацькі гаварылі на нашай гаворцы, а дадаткова мы выпісвалі, жывучы там, у горах, „Ніву". Я трымаў усе „Зоркі" і праз „Зорку" перапісваўся з іншымі дзяцьмі. Так вучыўся літаратурнай мове. Помню, калі мы прыязджалі на Беласточчыну і пераязджалі Буг дзесьці між Сарнакамі і Сямятычамі, то бацька заўсёды спяваў „Беласточчына, зямелька родная". Увогуле ў нас шмат спявалася. Збіраліся з маімі хрышчонымі, з іншымі, і спявалі. Нават калі нас не вучылі песень, то мы заслухоўвалі. А цяпер медыі натуральна знішчаюць нашу беларускую душу. Таму я з дзяцьмі ў школе спяваю. Калі бачу, што дзіця гаворыць па-свойму, то і я гавару таксама да яго. Але большасць не гаворыць і гэта віна бацькоў.

Фота Ілоны КАРПЮК

— А чаму не вучым дзяцей сваёй мове?

— Цяжка сказаць, але ў нас надта мала нацыянальнага пачуцця. Інакш, чым ва ўкраінцаў. Часам здаецца, што іх усюды зашмат, але яны абараняюць і прамуюць сваю мову і культуру. У нас працуюць беларускія ліцэі, але яны такія з назвы. Гэта быў бы вялікі выклік, калі б у іх усе прадметы выкладаліся б на беларускай мове і тады гэта было б прэстыжна. А да таго яшчэ працэсы глабальнай вёскі, еўрапейская тоеснасць — такія слабыя меншасці расплываюцца ў большасці. Каб у такой свабодзе не загубіцца, трэба мець моцную тоеснасць, а перш за ўсё павінны мець яе не толькі бацькі, але настаўнікі, інструктары, апекуны гурткоў. І трэба мець адпаведны падыход да працы і дзяцей. Трэба быць валанцёрам і хацець дзейнічаць. Я вучу ў школе, але вяду таксама гарцэрскі атрад, каля 150 дзяцей з усёй гміны. У рамках гарцэрства спяваем, чытаем, вучымся да конкурсаў. Пазітывісцкая арганічная праца. Рознымі спосабамі трэба пераконваць дзяцей у нашай іншасці, заняткамі, конкурсамі, гаварыць па-свойму. Наша беларускасць — як кветка. Трэба яе падлівасць, каб не засохла, а як будзем падліваць, то расквітнее.

— Чаму варта запісацца ў наступным перапісе беларусам?

— Мы проста павінны, калі так адчуваем сябе. З другога боку, калі нас больш, то тады дзяржава пра нас думае, і магчымасці пашыраюцца, і на культуру тады больш грошай у нас будзе. У наступным перапісе будзе можна пазначыць дзве нацыянальныя тоеснасці. Калі хтосьці адчувае сябе палякам і беларусам, то будзе мог так напісаць. Я правакацыйна магу падаць нацыянальнасць беларускую і лэмкоўскую (*смех*) і тады акажацца, што на Падляшшы лэмко жыве.

— Нашым людзям можа пайсці ў карысць такая магчымасць?

— Думаю, што можа павысіцца адсотак беларусаў. Я, напрыклад, буду пераконваць сваіх знаёмых так: добра, пішы паляк, як хочаш, але запішыся таксама беларусам. Тады застанецца свядомасць, што ўсё ж такі запісаўся беларусам. Лепш так, чым гаварыць „мы тутэйшыя, ні той, ні сёй", а ў выніку пішуцца палякамі. Думаю, наш абавязак — гаварыць, што варта запісацца беларусам або дапісаць беларускую тоеснасць. Усім пойдзе гэта ў карысць.

— Ці ёсць месца ў царкве на беларускую мову?

— Ёсць, апосталы гаварылі да людзей на мовах, якія людзі разумелі і хацелі пачуць. Старажытнацаркоўнаславянская мова гэта наша маці, але калі людзі гавораць на нацыянальных мовах, то таксама на іх павінна гаварыцца проповедзі ці нават служыць цэлыя літургіі. Трэба помніць аднак, што нацыянальныя мовы ў цэрквах павінны людзей аб'ядноўваць, не дзяліць. Па-першае, праваслаўе, а толькі пасля мова, высока, але ўсё ж такі пасля, бо быццё праваслаўным у царкве найважнейшае. Трэба помніць, што праваслаўны гэта не рускі, а каталік — не паляк. Праваслаўны гэта праваслаўны, гэта веравызнанне, а мова гэта другое. У нас так склалася, што беларусы гэта амаль самыя праваслаўныя, але я ведаю нават тут, на Гайнаўшчыне, многіх каталікоў, якія свабодна размаўляюць па-беларуску. На Сакольшчыне сустрэўся я з такой сітуацыяй, што гаварыў з каталікамі па-беларуску, а яны самі казалі, што ў іх якраз па-польску — то праваслаўныя. Да людзей трэба гаварыць на зразумелай мове. Калі б прыехаў да нас бацюшка з Фінляндыі і служыў на сваёй мове, напэўна яго не зразумелі б, так як мяне не зразумелі б у Кітаі, калі б пачаў служыць па-расейску.

Гутарыла Ілона КАРПЮК

КАФЕДРА БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ
Філалагічны факультэт
Універсітэта ў Беластоку
запрашае на
Беларускія чацвяргі інтэрдысцыплінарны канверсаторый
10 чэрвеня 2010
д-р Тамаш Вельг
„Творчасць Уладзіміра Караткевіча і дыскусія пра сучасную беларускую тоеснасць"
17.00, вул. Лінярскага 3, зала 1Б

ЗАПРАШЭННЕ

Аб'яднанне Бацькоў **АБ-БА** сардэчна запрашае на прэзентацыю артыстычнай творчасці дзяцей і моладзі, якая адбудзецца

11.06.2010 г. у 17.00 у ВААК („Сподкі") па вул. св. Роха 14 у Беластоку

У праграме:

1. Спектаклі ў выкананні ўдзельнікаў тэатральнага гуртка „Гульня ў тэатр":
— „Кастынг",
— „Пампільё",
— „Чырвоныя шапачкі".

2. Прэзентацыя дыска „Васількі-валошкі" з песнямі на словы Віктара Шведа з удзелам дзіцячай групы Студыі беларускага фальклору.

3. Музычная праграма ў выкананні ўдзельнікаў праекта „Падляшскія хронікі".

4. Развітанне з вучнямі, якія канчаюць пачатковую школу, гімназію і ліцэй.

5. Пачастунак і кірмаш

Малебен за дзяцей і моладзь, бацькоў і настаўнікаў адбудзецца **14.06.2010 у 18.00** у царкве св. Юр'я ў Беластоку.

ЗАПРАШЭННЕ

Беларуская нацыянальная памяць, Звяз беларускай моладзі, Беларускае аб'яднанне студэнтаў запрашаюць **12 чэрвеня 2010 г. на роварны рэйд памяці генерала Язэпа Булак-Балаховіча**. Старт а 12 гадзіне ад сядзібы Беларускага музея (вул. 3 Мая, 42) у Гайнаўцы — фініш у Белавежы.

Ушануем памяць тых, хто змагаўся каб жыла Бацькаўшчына!

Рада БНП

9 770546 196000

Наша ганьба

Такія артыкулы пішуцца альбо на добрым падпітку, альбо ў крайнім адчаі, альбо ад няма чаго сказаць. Няхай даруе мне шаноўны чытач, але не знаходжуся ні ў водным вышэйадзначаным стане, але нешта карціць, баліць і смыліць. Відаць, назбіралася ўсяго патроху. А можа ўсяго занадта шмат.

Чытаю прэсу, інтэрнэт і вачам сваім не веру. Абвешчаны конкурс беларускага ПЭН-цэнтра імя паэткі Ларысы Геніюш. Цешуся, але выяўляецца, што заўчасна. Кіраўнік арганізацыі, знакаміты на сёння паэт Андрэй Хадановіч кажа: „У гэтым годзе конкурс носіць імя беларускай паэткі Ларысы Геніюш, што звязана з святкаваннем яе стагодовага юбілею. Больш за 70 прац былі дасланыя маладымі паэтамі і празаікамі Беларусі да ўдзелу ў конкурсе... Мы з асаблівай радасцю віталі паэтаў і празаікаў, якія ідуць не па наезджанай традыцыі, а не баяцца рабіць нешта інакш... перамога тых ці іншых аўтараў вызначаецца выключна з пазіцыі ацэнкі якасці літаратуры, а ні ў якім разе не па моўным прынцыпе". Ну, загнуў аматар эпатажу і майстар рыфмаў кшталту „бай"- „tut.by". Я ўсё разумею, абвяшчайце свае крытэрыі як вы хочаце, як вы іх разумееце, але навошта цягнуць пад гэта святое імя Ларысы Геніюш?

Чытаю пра прэзентацыю праграмы новаспечанага кандыдата ў прэзідэнты Алеся..., прабачце Аляксандра Міхалевіча. Яна адбываецца досыць урачыста. Заўважце, у сталічнай гарадской Ратушы (ого!). І... на расійскай мове. І гэта палітык, які яшчэ ўчора называў сябе правым і кансерватыўным, прэтэндаваў на старшынства ў БНФ. А цяпер, маўляў, я на мове народа, каб людзям было зразумела, для большасці, так сказаць. Далей Міхалевіч з паплечнікамі праводзіць акцыю супраць міністра адукацыі Аляксандра Радзькова і робіць заяву (цытую): „Никто не сделал для разрушения белорусской системы образования больше, чем Александр Радьков. При нем были ликвидированы профильные классы, уменьшилось количество часов преподавания иностранных языков, ликвидирован такой необходимый с моей точки зрения предмет, как «Мировая художественная культура», а в реформе образования с перескакиванием с 11-классной на 12-классную систему обучения и обратно царит полный бардак". Пра самае страшнае разбурэнне і духоўнае злачынства — знішчэнне беларускамоўнага школьніцтва і беларускай вышэйшай адукацыі — як бачыце, ні слова.

Крыху раней вядомы беларускі паэт, амаль класік, Уладзімір Някляеў узначальвае грамадскую кампанію, якая выпускае паштоўкі „Говори правду!". Ну, канешне, калі мы будзем „Гаварыць праўду!", нас ніхто не зразумее... А яшчэ раней, кандыдаты ад скрозь „нацыяналістычнага" БНФ друкуюць на так званых мясцовых выбарах улёткі на расійскай мове. Гэта ж верны шлях да перамогі! Толькі не чуў я нешта, каб каму такая тактыка прынесла хоць бы лакальны поспех.

Пішу гэта не для таго, каб некага абразіць. Няхай не крыўдзяцца на мяне названыя асобы. Не я іх выбіраў, яны самі сябе паказалі, а за словы свае публічныя людзі мусяць мець адказнасць. Не толькі ў іх справа, таму што спіс імёнаў і аналагічных прыкладаў можна шырыць доўга. Тым больш, што кожны з нас можа прыгадаць сябе ў падобнай іпастасі. У Гродне, прыкладам, процьма культурна-асветніцкіх і адукацыйных арганізацый — ТБМ, ТБШ, Фонд імя Льва Сапегі, Асацыяцыя маладых навукоўцаў „Віт", Цэнтр падтрымкі грамадскіх ініцыятываў „Трэці сектар", грамадскія праваабаронцы і незалежныя журналісты, прыналежныя да БАЖу (гэта толькі самыя вядомыя і нібыта дзейсныя суполкі). І што ў выніку — аніводнага беларускамоўнага класа ў школах горада, аніводнай беларускамоўнай групы ў дзіцячым садку! А мы ж так рупліва працавалі ўсе гэтыя гады, так шчыравалі на ніве асветніцтва, аддавалі сябе да рэшты высакароднай мэце пабудовы грамадзянскай супольнасці. І дзе яна, тая супольнасць? Ці не прыйшла пара, спадары, нам сваю дзейнасць кардынальна перагледзець і альбо зноў стаць найперш нацыянальнымі адраджэнцамі, альбо зысці з грамадскай дзейнасці зусім і рыхтаваць сабе старасць у цёплых і ўтульных пасцелях!?

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Адборачныя абцугі

Калі думаю пра найпрыгажэйшы дзень года ў маім дзяцінстве, як не дзіўна, прыходзіць на памяць не першае чэрвеня, не Вялікдзень, і нават не Каляды. Узгадваецца Успленне. Або — Сплінне, на мясцовай нашай гаворцы. Гэты дзень красаваў у царкоўным календары напрыканцы вакацыяў. 28 жніўня на маёй малой Бацькаўшчыне адбываўся царкоўны фэст, одпуст. Усе, хто жывы, хто сяк-так трымаўся на нагах, цягнуліся ў Вэрсток. Пешшу, на ровары, фурманкай. Царкоўку, збудаваную ў другой палове васемнаццатага стагоддзя, з усіх бакоў абступалі шапікі вандроўных гандляроў. Чаго там і не было! Каляровыя цукеркі і каляровыя шарыкі. Бліскучыя пісталеты і бліскучыя пярсцёнкі. Пластмасавыя наручныя гадзіннікі і пластмасавыя танкі. Для большых пацаноў прапаноўваліся люстэркі з выявамі аголеных жанчын, для малых — з фоткамі нацыянальных герояў, прыкладна — з фатаграфіяй капітана Клёса, польскага Штырліца. У гэты дзень нашы бацькі выступалі спонсарамі. Дзяўчынкі, як дзяўчынкі — траціілі грошы на лялькі-пярсцёнкі і ўсё астатняе барахло, а вось мы, хлопцы, пераапрананаліся ў сапраўдных афіцэраў, у каўбояў, у шэрыфаў. І вёска да цёмнай ночы гудзела сапраўднай стральбой амаль сапраўдных пісталецікаў. Праз дзень-два свет вяртаўся на сумныя рэйкі і ўсе мы, аднадзённыя шэрыфы, павесіўшы насы, тэпалі ў школу.

Чаму ўзгадаўся мне якраз цяпер, у чэрвені, гэты жнівеньскі царкоўны фэст? Як не дзіўна — праз палітыку.

Прэзідэнцкія выбары ў Беларусі не за гарамі, хаця канкрэтную дату пакуль што ведаюць Гасподзь-Бог, Аляксандр Лукашэнка і Лідзія Ярмошына, а двум апошнім вядомы і вынік выбараў. Тым не менш штодзень папаўняецца спіс ахвотных паўдзельнічаць у гэтым гаманлівым фэсце, у гэтым своеасаблівым „одпусце". Сорамна не балатавацца, калі ідуць у прэзідэнты ўсе суседзі з нашай вуліцы. Не гонар.

Добрых кандыдатаў у нас што пяску на пустыні. Адзін БНФ знайшоў у сваіх шарэнгах чатырнаццаць годных першай пасады ў краіне. А такіх БНФаў хоць адбаўляй. У выніку калона гоншчыкаў выстраілася ого-го, а мо і даўжэй за ого-го. Каго там і няма? Ну, дакладна, няма школьнікаў і студэнтаў, бо несправядлівы выбарчы закон усіх, каму не споўнілася трыццаць пяць, лічыць грамадзянамі другой катэгорыі. Усе астатнія — калі ласка. Паголеныя і барадатыя. Тоўстыя і худыя. Спелая моладзь і пенсіянеры. Нехта раней кіраваў універсітэтам, а нехта вадзіў дзіцячую каляску. Скептыкі скажуць — ну які ж гэта досвед руліць каляскай? О, не, паны скептыкі. Вадзіць дзіцячую каляску — не абы-якая адказнасць. Гэта ж адказнасць за лёс наймалодшага пакалення.

Карацей — усе нашы кандыдаты годныя прэзідэнцкага крэсла і ўсе роўныя. І менавіта ад гэтай роўнасці ўзнікае праблема. Якім чынам вылузаць з натоўпу кандыдата найлепшага, адзінага? Або, у крайнім выпадку, двух адзіных, ці — траіх адзіных. Праблема невырашальная, у кожнага кандыдата ў кандыдаты свой жа варыянт адбору.

Ёсць на нашай Гайнаўшчыне ці не сотня агратурыстычных сядзіб і ўсе яны змагаюцца за выжыванне. Адзін гаспадар прапануе гарадскім панам сялянскае малако, другі — прагулку на ровары, трэці — спакушвае начлегам на сенавале. Усё банальнае, і ўсё ўжо было. І вось у адной сядзібе прыдумалі нешта абсалютна арыгінальнае — чэмпіянат свету па кіданні кавальскіх абцугоў. Прыязджаеш сюды звычайным турыстам, а вяртаешся дамоў як чэмпіён свету.

Паколькі Беларусь даўно ўжо ўзяла цвёрды курс на развіццё спорту і агратурыстычнага сектара, варта падумаць ці не вылучыць адзінага кандыдата ў прэзідэнты менавіта такім шляхам — праз чэмпіянат па кіданні абцугоў. Кавальскіх, цяжкіх, каб не ўзнікала сумневу, што наш кіраўнік — усім мужыкам мужык. Выходзіць на пляцоўку Мілінкевіч — ба-бах, трыццаць метраў семнаццаць сантыметраў. Напружыў мускулы Міхалевіч і — трыццаць метраў сорак два. Спрытам махнуў жалеза Рымашэўскі — трыццаць адзін, а Саннікаў — дваццаць шэсць. Але не трэба складаць рук. Гэта ж першы тур. У другім або трэцім усё можа памяняцца і апошнія стануць першымі. Сантыметр скажа праўду. Кожны кандыдат можа выступіць кавалём свайго прэзідэнцтва, а нам, звычайнаму электарату — эмоцыі, эмоцыі, эмоцыі. Да апошняга кідка. Як на царкоўным фэсце.

А я, пакорлівы і аб'ектыўны ваш слуга Міхал Андрасюк, не супраць узяць на сваю спіну абавязкі старшыні **абмерачна-адборачнай** камісіі.

Міхал АНДРАСЮК

Вачыма еўрапейца

20 гадоў самаўрада

Ва ўсёй Польшчы, між іншым і ў Беластоку, адзначалася дваццатая гадавіна выбараў у адроджаны тэрытарыяльны самаўрад. Сейм і Сенат РП прынялі з гэтай нагоды спецыяльныя пастановы. Можна ў іх прачытаць: „Дзякуючы адраджэнню самаўрада палякі атрымалі права на супольнае вырашанне аб сваіх лакальных, а пасля і рэгіянальных супольнасцях (...). З перспектывы «малых айчын» найлепш відаць, як змянілася Польшча". І гэта праўда. Простым вокам відаць змены, якія адбыліся дзякуючы дэцэнтралізацыі ўлады, значыць, пераносу шмат якіх кампетэнцый на ўзровень гмін, паветаў ці самаўрадавых ваяводстваў. Мабыць, было гэта магчымае дзякуючы ангажаванасці самых жыхароў, перш за ўсё шляхам актыўнага і пасіўнага ўдзелу ў выбарах. Што цікавае, прысутнасць у першых выбарах у гміны 27 мая 1990 года была адносна высокая; складала 42,3 працэнта.

У Беластоку дваццацігоддзе самакіравання святкавалі пад ратушшу. Былі прамовы і канцэрт вядомых мясцовых і агульнапольскіх ансамбляў. Пры гэтай нагодзе паставіў я пару пытанняў падляшскаму ваяводу Мацею Жыўну, які выконвае ролю прадстаўніка ўрада ў глыбінцы, назіраючы галоўным чынам за юрыдычным бокам (рашэннямі) самаўрадаў. Распытваны пра тое, што ад самаўрадаў маюць падляшане, адказаў:

— У канкрэтным, матэрыяльным маштабе — паправу якасці жыцця дзякуючы інфраструктурным інвестыцыям, значыць, пабудове дарог, школ, новых спартыўных аб'ектаў і іншых будынкаў публічнага карыстання. Самаўрады добра гаспадараць сваімі сродкамі і паспяхова хадайнічаюць за фонды з дзяржбюджэту ці Еўрасаюза. У нематэрыяльным маштабе — дзякуючы функцыянаванню мясцовых самаўрадаў узнікае супольнасць, пачуццё адказнасці за тое, што адбываецца на канкрэтнай тэрыторыі, вызваляюцца ініцыятывы — не толькі тыя, арганізаваныя самаўрадаўцамі, але і звычайнымі людзьмі, якія бачаць сэнс дзеяння для сваіх мясцовых груп жыхароў.

Я папрасіў таксама ваяводу пералічыць гміны ў паўднёва-ўсходняй частцы Беласточчыны, якія, на яго думку, найбольш спраўныя ў дзейнасці. Адказаў досыць падыпламатычнаму: „Паводле маёй ацэнкі, самаўрады здаюць гэты цяжкі экзамен. Цяжка, аднак, сказаць, якія з самаўрадаў здаюць яго найлепш, а якія горш. Паколькі так і гміны, як і паветы адрозніваюцца паміж сабою — маю на думцы і геаграфічнае распалажэнне, як і натуральныя, прыродныя каштоўнасці, таксама і лік жыхароў.

Дадаў таксама пры нагодзе нашай размовы:

— У час выконвання мною функцыі ваяводы, урадавай адміністрацыяй былі перададзеныя чарговыя кампетэнцыі, якіх, дарэчы, самаўрады самі дамагаліся — як, напрыклад, асяродкі сельскагападарчай канстультацыі. Гэта аблягчае здабыванне еўрасаюзных сродкаў, а маршалку дае прылады для вядзення стратэгіі на вясковых тэрыторыях.

На маю думку, аднак, незалежна ад аптымістычных слоў, з функцыянаваннем самаўрадаў не зусім яшчэ так ідэальна. Хібы прыкмячае сам прафесар Міхал Кулеша, архітэктар самаўрадавай рэформы. Успамінае ён між іншым:

— Цэнтральная ўлада акрэсліла абшары, над фінансаваннем якіх хоча трымаць кантроль, што абазначае паменшанне самастойнасці гмін.

Незалежна ад праблем, з якімі надалей змагаюцца самаўрады, найважнейшым — на маю думку — з'яўляецца тое, што іх узнікненне дало рэальны шанц кожнаму з нас вырашаць пра тое, хто будзе ўплываць на змену нашай найбліжэйшай рэчаіснасці. Варта памятаць пра гэта ўжо цяпер, на некалькі месяцаў да чарговых самаўрадавых выбараў.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Калі побач Трывежы будзе керамічнае прадпрыемства?

Хаця ўжо здавалася, што ўправа сейміка Падляшскага ваяводства запаліла аўстрыйскаму прадпрыемству „Leier” зялёнае святло ў справе будовы побач Трывежы фабрыкі будаўнічай керамікі, то яно хутка згасла. Управа сейміка самастойна магла памяняць прызначэнне вялікай часткі палёў купленых суполкай „Leier” побач Трывежы з сельскагаспадарчага на здабывальнае, каб можна было на іх здабываць гліну. Аднак 15 гектараў зямель трэцяга класа якасці, распаложаных у стратэгічным месцы будучай інвестыцыі, магло быць пераведзеных на здабывальнае прызначэнне толькі Міністэрствам сельскай гаспадаркі і выдача пастановы ў гэтай справе ў міністэрстве надоўга замарудзілася. У гэтым жа самым часе паявіліся перашкоды ў справе раней абяцанага давядзення трубамі прыроднага газу з Вышак да Трывежы, які неабходны ў працэсе вырабу будаўнічай керамікі. Мінулі ўжо два з паловай гады з моманту, калі суполка „Leier” купіла ад трывежскіх гаспадароў зямлю і афармляе справы, якія папярэджваюць будову фабрыкі і здабыванне гліны. Людзі, зацікаўленыя новай інвестыцыяй у Гайнаўскай гміне, пытаюцца калі побач Трывежы ўзнікне керамічнае прадпрыемства.

Непасрэдна перад Трывежай (налева, едучы з Новага Корніна) мае быць распаложанае прадпрыемства будаўнічай керамікі (офіс і далей прадукцыйная лінія)

Ці можна разлічваць на газаправод?

Першапачатковыя размовы аб давядзенні ў Трывежу трубаў, якімі пастаўляўся б газ патрэбны ў прадукцыйным працэсе, закончыліся паспяхова і суполка PGNiG абяцала пракласці газаправод праз Бельск-Падляшскі, Новае Беразова і Новае Корніна. Пасля змяніліся планы і газавая магістраль мела ісці крыху акружным шляхам, праз Гайнаўку, Чыжыкі і Новае Корніна, але ў 2008 годзе суполка PGNiG увогуле адмовілася рэалізаваць новую газавую інвестыцыю на Бельшчыне і Гайнаўшчыне з-за фінансавых складанасцей у самім прадпрыемстве. З гэтага моманту перш за ўсё самаўрадавыя ўлады Гайнаўшчыны і суполка „Leier” безвынікова вядуць размовы з газавай суполкай. Віцэ-прэм’ер і заадно міністр эканомікі Вальдэмар Паўляк заявіў у Гайнаўцы, што зараз газу хапае не толькі ўсім яго пакупнікам, але і паяўляюцца папрокі ў тым, што закантрактавалі яго замнога.

— Газ прадаецца па ўсёй Польшчы з прыбыткам і я не бачу прычын чаму не меў бы пастаўляцца ў Гайнаўскі павет, калі тут ёсць на яго запатрабаванне. Хіба, што тут так малое запатрабаванне на газ, што нерэнтабельным становіцца пракладка газаправода, — сказаў міністр эканомікі Вальдэмар Паўляк і дадаў, што сам спраўдзіць, па якой прычыне не пракладваюцца газавыя трубы на Гайнаўшчыну.

— Адзін з палітыкаў абяцаў ужо нам пахадайнічаць перад суполкай PGNiG у справе давядзення да нас прыроднага газу, але пасля я ўчула ад яго, што цяжка лабіраваць у справе нерэнтабельнай інвестыцыі, — заявіла войт Гайнаўскай гміны Вольга Рыгаровіч. — Аднак мы паінфармавалі PGNiG, што запатрабаванне на газ паводле ўступных нашых падлікаў будзе на ўзроўні 70 мільёнаў кубаметраў у год, што было б немалой колькасцю.

У Трывежы, Новым Корніне і Новым Беразове гмінныя чыноўнікі апыталі жыхароў і многа сямействаў праявіла ахвоту падключыцца да газавай сеткі.

— Нядаўна ў кіраўніцтве PGNiG адбыліся персанальныя змены і зараз ізноў вядуцца размовы паміж суполкамі „Leier” і PGNiG у справе давядзення газу трубамі з Вышак, распаложаных у адлегласці 15 кіламетраў ад Бельска-Падляшскага, да нашай вёскі, — гаварыў солтыс Трывежы Канстанцін Салавянюк.

На гэтай інвестыцыі маглі б таксама скарыстаць жыхары Бельска, Гайнаўкі і меншых гмін Бельшчыны і Гайнаўшчыны, паколькі можна было б да галоўнай трубы падключаць газавыя сеткі ў паасобных гмінах. Аднак, покі няма рашэнняў у справе вялікіх газавых інвестыцый, прадбачваецца, што ў першым этапе дзейнасці прадпрыемства будаўнічай керамікі ў прадукцыйным працэсе будзе выкарыстоўвацца даражэйшы звадкаваны газ, давезены цыстэрнамі і перапампаваны ў вялікія ўмяшчальнікі.

Надзея на хуткія будаўнічыя работы

У прыцягненне вонкавага капіталу ў родную вёску вельмі моцна заангажаваўся солтыс Трывежы Канстанцін Салавянюк. У размове прызнаўся, што цяжкімі былі размовы паміж будучымі інвестарамі і мясцовымі жыхарамі, покі абодва бакі выпрацавалі ўмовы, на якіх восенню 2007 года былі прададзены 60 гектараў зямлі пад керамічнае прадпрыемства. Адной з прычын адтэрмінавання выдачы Міністэрствам сельскай гаспадаркі пастановы ў справе змены прызначэння сельскагаспадарчых зямель побач Трывежы была нядаўняя іх меліярацыя, у галоўным за сродкі Еўрасаюза, а прадбачвалася, што прынамсі 5 гадоў гэтыя грунты будуць выкарыстоўвацца ў сельскагаспадарчых мэтах. Аднак прадстаўнікі суполкі „Leier” заявілі, што яны гатовы вярнуць 500 тысяч злотых, выкарыстаных на меліярацыю згаданых палёў. Пасля доўгіх размоў кіраўніцтва суполкі з управай Падляшскага сейміка і чыноўнікамі Міністэрства сельскай гаспадаркі прыблізна год таму была выдадзена згода на змену прызначэння 15 гектараў палёў трэцяга класа з сельскагаспадарчага на здабывальнае. У тым часе памяняліся распараджэнні і ўжо ўлады Гайнаўскай гміны памянялі прызначэнне 45 гектараў палёў чацвёртага і пятага класаў на здабывальнае (раней такую пастанову магла выдаць толькі ўправа Падляшскага ваяводства).

— Я трымаю непасрэдны кантакт з суполкай „Leier” і таму ведаю, што абяцаюць ім у хуткім часе даць канцэсію на здабыванне гліны, — заяўляе солтыс Трывежы Канстанцін Салавянюк, што ўвесь час сочыць за падрыхтоўкай да інвестыцыі. — Ёсць ужо ў Гайнаўскай гміне план добраўпарадкавання зямель, што купіла суполка „Leier”, і будуць выконвацца падрабязныя праекты будовы керамічнай фабрыкі. Калі суполка атрымае ўсе дазволы, яшчэ восенню гэтага года магло б распачацца здыманне верхняга пласта зямлі, каб дабрацца да залежаў гліны.

Грошы ад падаткаў і новыя месцы працы

Раней прадбачвалася, што падаткі ад дзейнасці керамічнага прадпрыемства ў Гайнаўскай гміне саставяць на працягу года пад мільён злотых. Хаця гэта ў новых пераліках магло б крыху памяняцца, то трэба далічыць да гэтых сродкаў яшчэ грошы ад падаткаў з прадпрыемстваў, якія будуць супрацоўнічаць з суполкай „Leier” і выконваць яе заказы.

— Суполка „Leier” павінна даць месцы працы нашым жыхарам і ў мяне ёсць надзея, што спрычыніцца гэта да затрымання ў нашай гміне маладых адукаваных людзей, — лічыць войт Гайнаўскай гміны Вольга Рыгаровіч.

— Разлічваем, што ў Трывежы ў новай фабрыцы знойдзе працу недзе пад 70 работнікаў. Хаця асноўная прадукцыя будзе аўтаматызаваная, дык патрэбныя будуць не толькі офісныя работнікі і спецыялісты, але трэба ж будзе таксама прыняць на работу фізічных працаўнікоў да перагрузкі цэглы з выкарыстаннем тэхнікі, да працы на экскаватарах і да іншай работы, — пералічвае спадар Салавянюк.

Керамічныя вырабы паводле выпрабаваных рэцэптур

Аўстрыйская суполка „Leier” у 1988 годзе заснавала Фабрыку будаўнічых матэрыялаў у Мальбарку, якая спецыялізуецца ў прадукцыі бетонных матэрыялаў і пазней пераняла адну з самых вялікіх цагельняў на поўдні Польшчы — Тарнаўскае прадпрыемства будаўнічай керамікі, якое зараз з’яўляецца адным з самых сучасных у Польшчы і менавіта кіраўніцтва тарнаўскай суполкі наглядае за падрыхтоўкай да будовы керамічнага прадпрыемства побач Трывежы. Трывежскі солтыс Канстанцін Салавянюк разам з самаўрадаўцамі Гайнаўскай гміны ездзіў у Тарнаў і прыглядаўся аўтаматызаванаму вырабу будаўнічай керамікі.

— Трывежскае прадпрыемства не будзе шкодным для асяроддзя. Прадукцыя будзе тут адбывацца паводле сучасных тэхналогій і не будуць узнікаць адкіды, якія маглі б шкодзіць акружаючай Трывежу прыродзе, — упэўненая войт Гайнаўскай гміны Вольга Рыгаровіч.

Трывежская фабрыка будзе магчы працаваць доўга, бо першапачаткова залежы гліны ацэньваліся на 4 мільёны кубаметраў (у глыб сягаюць яны нават да 25 метраў), аднак у час больш падрабязных праверак аказалася, што гліны тут намнога больш.

— Прадукцыя будаўнічай керамікі будзе ў нас аўтаматызаваная. Калі загрузіць гліну ў адпаведныя ўмяшчальнікі, то ўвесь працэс вырабу цэглы будзе адбывацца аўтаматызавана, а работнікі будуць ужо займацца толькі загрузкай акуратна ўпакаванай цэглы, — кажа солтыс Канстанцін Салавянюк і дадае, што ў Трывежы ніхто не аспрэчвае будовы новага прадпрыемства. — Будовы фабрыкі і здабывання гліны не апасаюцца жыхары нашага сяла. Людзі пытаюцца мяне, калі пачнецца прадукцыя. Не спаткаўся я з выпадкамі, каб нейкія асобы крытыкавалі новую інвестыцыю.

— А чаго ж мне баяцца? Я пакінуў сабе 2 гектары зямлі распаложанай побач майго панадворка, каб прадпрыемства не даходзіла неапасрэдна да нас, а каля 10 гектараў поля прадаў на патрэбы цагельні, — гаварыў раней Мікола Габрылеўскі. — Кажуць, што выпальваць цэглу будуць з прымяненнем газу і не павінна быць смуроду ад прадукцыйнага працэсу.

Людзі з Трывежы апасаліся, што знішчаць дарогу ў сяле, але абяцалі ім, што зробяць аб’язную дарогу вакол вёскі і грузавыя машыны не будуць ездзіць непасрэдна праз сяло. Аднак транспарт цэглы можа стварыць праблемы па-за Трывежай, якія будуць мусілі вырашыць перш за ўсё ўлады Гайнаўскага павета, бо павятовая дарога ідзе з Трывежы ў напрамку Ласінкі і Новага Беразова. Прынамсі жыхары Новага Корніна і Новага Беразова апасаюцца, што грузавыя машыны паразбіваюць непрыстасаваную да вялікага транспарту павятовую дарогу ад Трывежы да шашы Гайнаўка — Бельск-Падляшскі. Электрычная энергія патрэбная ў прадукцыйным працэсе мае пастаўляцца лініяй, што зараз ідзе з Гайнаўкі ў Трывежу і далей у Курашава, якая ў бліжэйшым часе мае быць мадэрнізаваная. Непасрэдна побач дарогі Новае Корніна — Трывежа (перад самой Трывежай налева) плануецца будова офісных будынкаў, а за імі мае знаходзіцца прадукцыйная лінія керамічных вырабаў. Далей маюць быць складскія плошчы для гліны.

Дзень маці

25 траўня Саюз польскіх пенсіянераў у Чаромсе арганізаваў мерапрыемства. Не была гэта імпрэза па загадзя напісаным сцэнарыі, але сяброўская сустрэча, якую арганізавалі для культурнага правядзення часу.

— Мы даўно рыхтаваліся арганізаваць імпрэзу, — сказаў ва ўступным слове старшыня пенсіянерскай арганізацыі Юзаф Дубковіч, — але не было зручнага моманту для яе ажыццяўлення. Некалькі разоў рэкамендавалі экскурсіі. Паколькі прапанавалі невялікую даплату ад удзельніка, на заяву адгукнуліся нямногія. Маем грошы на краязнаўчыя паходы і хочам, каб вы, паважаныя сябры і сяброўкі пакарысталіся гэтай магчымасцю.

— Сёння святкуем трэці дзень Сёмухі, — працягваў старшыня пенсіянераў, — а заўтра адзначаем Дзень маці. Затым ёсць нагода для святочнага застолля. Гуляйма тады і весялімся...

Пасля афіцыйнай заявы Юзаф Дубковіч павіншаваў маці з нагоды іхняга свята. Да віншаванняў далучыўся войт Міхал Врублеўскі, які, спасылаючыся на традыцыю святкаванняў, прыгадаў як міжнародная грамадскасць адзначае Дзень маці. Затым пачаўся пачастунак, а войт са старшынёю ўручылі новым членам арганізацыі білеты.

За сталамі багата застаўленымі бутэрбродамі, смакоццямі і напіткамі заселі ў вясёлай кампаніі мамкі са сваімі партнёрамі з Чаромхі-Станцыі, вёскі Чаромхі, Кузавы, Ставішчаў, Вулькі-Тэрахоўскай, Зубач і адлеглай Баброўкі. У такой кампаніі ніхто не адчувае сябе адзінокім. Нават старэнькія бабулькі лічылі сябе бадзёрымі ды ў танцы кружылі, не адстаючы ад маладых. А падыгрываў вядомы майстар Сцяпан Копа. Пад гукі гармоніка ўдзельнікі сустрэчы спявалі рускія, беларускія, украінскія і польскія песні — франтавыя і любоўныя, сучасныя ды даўнія: „Ціха вода", „Вё, коніку" ці „Амурскія волны", „Рабінушку" або „Гэй, соколы". У перапынках уключалі дыска-полевую музыку і тады маладыя гулялі да ўпаду. Варта адзначыць, што важаком-запявалам выступіў Грыша Бацюк з вёскі Чаромхі, хаця і іншыя не заставаліся ззаду. Адным словам, чаромхаўскія пенсіянеры вясёла і культурна адзначылі Дзень маці!

Уладзімір СІДАРУК

Выбоіны

Паказны запаведнік зуброў, што непадалёку Белавежы, з'яўляецца адным з найчасцей наведваных турыстамі аб'ектаў на тэрыторыі Белавежскай пушчы. Дабрацца да яго можна паварочваючы ў абазначаным месцы з шашы Гайнаўка — Белавежа на грунтавую, лясную дарогу, што вядзе ў Нараўку. І тут пачынаюцца праблемы! На паўкіламетровым адрэзку, які трэба праехаць, каб трапіць у запаведнік, адны толькі выбоіны. Назіраў я нядаўна, як вадзіцелі прабуюць усётакі пераадолець гэты адрэзак дарогі. Едуць вельмі паволі, круцячы рулём на ўсе бакі, а калі ўжо даедуць, выходзяць з аўтамабіля спацелыя, ад злосці чырвоныя на твары і з лаянкай на вуснах. Ці ўсе адказныя за гэтую дарогу абудзяцца ўрэшце з зімовага сну і давядуць яе да нармальнага стану? Добра заахвочваць турыстаў наведваць пушчу, але трэба таксама да іх прыёму падрыхтавацца!

Пётр БАЙКО

Тры дні ў Беларусі

Віктар БУРА

Другая палова мая 2010 года надоўга запамятаецца мне з-за паездкі ў Беларусь. Тры дні (17-19 мая) пабываў я на радзіме Янкі Купалы і Якуба Коласа. Сустрэўся я з людзьмі з акдрытай шчырай душой, гатовымі несці нам, беларусам у нашай малой Айчыне — Беласточчыне, дапамогу ў штодзённым жыцці. З вялікім гонарам і радасцю апісваю ўсё тое, што я пачуў і пабачыў.

У Таварыстве „Радзіма". Злева: Максім Дубянок, Галіна Навіцкая, аўтар і Наталля Тактасунава

Першы дзень пабыўкі прайшоў мне ў Гродне. Спярша наведаў я Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей. Яго дырэктар Юры Кітурка, кандыдат гістарычных навук, дэталёва пазнаёміў мяне з музеем. Музей заснаваны быў у 1920 годзе і ў другой палове бягучага будзе адзначаць 90-гадовы юбілей. Цяпер у музеі працуе каля ста чалавек у аддзяленнях гісторыі, прыроды, мастацтва, рэдкай кнігі, у навукова-асветніцкім і навукова-метадычным фондах і інш. У музеі адбылася сустрэча з Надзеяй Трухановіч — былой намесніцай старшыні Гродзенскага абласнога аддзялення Беларускага фонду культуры ў 1987-1996 гадах. У свой час трымала яна шчыльны кантакт з Канстанцінам Майсенем. Надзея Трухановіч дэталёва расказала аб аб'ёме дапамогі, аказанай БФК Грамадскаму камітэту пабудовы Беларускага музея ў Гайнаўцы. Навуковы супрацоўнік Гродзенскага музея Алена Жарына пазнаёміла мяне з горадам і яго помнікамі, звазіла на Нёман, паказала масты на ім.

Пасля адбыўся г.зв. „круглы стол" у рэдакцыі „Гродзенскай праўды". У гэтай сустрэчы ўдзельнічалі начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама Аляксандр Лойка, першы намеснік старшыні ўпраўлення ідэалагічнай работы Гродзенскага аблвыканкама Павел Сухарукаў, дырэктар ГДГАМ Юры Кітурка, журналісты газет і тэлебачання. Усе яны цікаваліся жыццём і культурна-асветнай дзейнасцю беларусаў у Польшчы, між іншым нашым штотыднёвікам і Беларускім музеем у Гайнаўцы.

На начлег пасялілі мяне ў інтэрнат Гродзенскага дзяржаўнага музычнага каледжа па вул. Купалы 57. У інтэрнаце на бясплатнай аснове пражываюць студэнты, якія абучаюцца музыцы. Прасторныя пакоі абсталяваны ўсімі выгодамі, усюды чысціня і парадак, а студэнты паводзяць сябе ўзорна, з высокай культурай. Загадчыцай інтэрната з'яўляецца Людміла Вяршэнка — вельмі сімпатычная, мілая жанчына, якая працуе тут ад пачатку існавання інтэрната. Прымала мяне на начлег дзяжурная па інтэрнаце Леакадзія Кахновіч.

На другі дзень, 18 мая, а палове шостай раніцы на мікрааўтобусе „Газель", за рулём якога сядзеў Мікалай Калбаско, адправіліся мы ў Мінск. Перад намі было 300 км дарогі, больш-менш тры з паловай гадзіны язды. З Гродна да Мінска вядзе шасціпалосая аўтастрада. У абодва бакі — вялікі паток транспарту: аўтафуры, аўтобусы, легкавікі. Дарога шыкарная, здаецца што не едзем, толькі ляцім.

У Мінску спыняемся на вуліцы Захарава 23. Тут знаходзіцца Беларускае таварыства па сувязях з суайчыннікамі за рубяжом „Радзіма". Сардэчна сустрэлі мяне старшыня праўлення „Радзімы" Максім Дубянок і яе каардынатаркі Галіна Навіцкая і Наталля Тактасунава. Пасля доўгай, дзелавой сустрэчы мае суправаджаючыя перавезлі мяне на другую сустрэчу ў Згуртаванні беларусаў свету „Бацькаўшчына". Тут сардэчна сустрэла мяне кіраўнік „Бацькаўшчыны" Алена Макоўская. Прысутныя цікавіліся нашай культурна-асветнай дзейнасцю на Беласточчыне, Гайнаўшчыне, між іншым Беларускім музеем, якія будаваўся беларусамі ўсяго свету.

У Згуртаванні „Бацькаўшчына". Злева: Алена Макоўская, аўтар, Юры Кітурка

Чарговымі этапамі маёй пабыўкі ў Мінску была сустрэча з намеснікам міністра культуры Тадэвушам Стружэцкім, а пасля спатканне з земляком, ураджэнцам Бандароў, Уладзімірам Казберуком і яго сям'ёй. Позняй ноччу вярнуліся мы ў Гродна.

У апошні дзень, 19 мая, на машыне падаліся мы наведваць горад і падгродзенскія вёскі. Сустракалі мы людзей, гутарылі з імі пра жыццё-быццё. Уражанні ад паездкі — вельмі станоўчыя. Усюды вельмі добра дагледжаныя дарогі, пры іх густоўныя, каляровыя аўтобусныя прыпынкі з беларускім арнаментам, лавачкі, сметніцы. Навокал чысціня і парадак. Абочыны дарог абкошаны, нідзе не відаць пустазелля, кустоў ці сухога голля. На палях не ўгледзіш нават лапіка неапрацаванай зямлі. Растуць прыгожы высокі рапс, пшаніца, жыта, авёс. На сенажацях — высокая трава. Цягнуцца вялікія палеткі бульбы. Відаць, што працуюць тут добрыя гаспадары. Ёсць чаму радавацца і з каго браць прыклад.

За тры дні пабыўкі ў Беларусі не давялося мне бачыць п'яных на вуліцы, ані некультурных паводзін, ні лаянкі ў публічным месцы, ні курцоў кідаючых недакуркі пад ногі. Усюды чысціня і парадак.

Усяго пабачанага не апісаць. Я проста зачараваным тым усім, што я пабачыў, наведаў, з чым пазнаёміўся, чаго пасмакаваў. А які хлеб беларускі — проста смаката: пухкі, духмяны, без кансервантаў. Сустрэў я вельмі адкрытых, сардэчных і радасных людзей, сапраўдных сясцёр і братоў. Вельмі цаню сустрэчы з важнымі дзеячамі прыхільнымі нам, беларусам Беласточчыны, Бельшчыны, Гайнаўшчыны. Яны гатовы нам дапамагаць у розных галінах, напрыклад, Беларускаму музею ў Гайнаўцы. Такая дапамога магчымая ў рамках „Праграмы па падтрымцы беларусаў замежжа".

Праз пасрэдніцтва „Нівы" сардэчна дзякую тым асобам, якія прычыніліся да запрашэння мяне ў Беларусь, якія сарганізавалі сустрэчы ў Гродне і Мінску. Асабліва вялікае дзякуй кірую ў адрас упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама: яго начальніка Аляксандра Лойкі і спецыяліста па культурных сувязях Уладзіміра Яраша.

Выконваем розную музыку

Фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Размова з **Ларысай Іконнікавай**, дырыжорам Жаночага камернага хору Дзяржаўнага музычнага каледжа з Гродна.

— Ваш хор жаночы. Ці ў Каледжы ёсць таксама нейкая мужчынская харавая група?

— Не. Наш хор выключна жаночы. Пакуль у нас мужчын-вакалістаў няма, але ў будучым годзе спадзяемся што будуць. Мужчыны ёсць на аддзяленні струннікаў і духавікоў нашай вучэльні.

— Ці Вашы спявачкі выступаюць таксама з акампанементам аркестра?

— Так. Мы маем у нас некалькі асоб, якія маюць ад прыроды вельмі прыгожыя галасы і яны спяваюць з аркестрам, спяваюць пад фартэпіяна, выступаюць з канцэртамі. Наша салістка Аліса Лапёнак з'яўляецца лаўрэаткай міжнародных вакальных конкурсаў.

— Ваш хор выконвае не толькі сакральную музыку...

— Мы выконваем розную музыку. Спяваем каталіцкія вакальныя творы. Мы спяваем музыку савецкіх кампазітараў, сучасных кампазітараў. Спяваем творы з акампанементам і без акампанементу. Выконваем народную і эстрадную музыку, маем спецыяльныя забаўляльныя праграмы, дзе многа папулярнай эстраднай музыкі. Маем у рэпертуары музыку з мюзіклаў, спірычуэлсаў...

— Вы сказалі што выконваеце каталіцкую музыку. А які канфесійны профіль Вашага хору?

— У нас каля паловы католікаў і столькі ж праваслаўных. Я сама з'яўляюся матушкай, мой муж святар. Таму мая схільнасць большая ў напрамку праваслаўя.

— Вашы харысткі прымаюць удзел у богаслужэннях?

— Так, яны спяваюць і ў Каложскай царкве, і ў Пакроўскім саборы, у царкве Усіх Святых, ва Уладзімірскай царкве, памагаюць там. Да нас часта звяртаюцца каб некага прыслаць, нейкую дзяўчыну для выканання партыі, напрыклад, сапрана, таму што патрэбны такі голас. Ну, я прапаную і дзяўчаты па нядзелях спяваюць.

— А каталіцкі рэпертуар Вы таксама недзе прэзентуеце?

— Мы літаральна напярэдадні выезду ў Беласток далі канцэрт у гродзенскім Бернардзінскім касцёле; нас туды запрасіў ксёндз Раман. Прысутнічалі епіскапы і семінарысты. Яны былі захоплены канцэртам, толькі адзначылі, што ў іх іншы напрамак, у іх большы націск на малітоўнасць чым на вытанчанасць. Мы там спявалі музыку Моцарта, „Stabat Mater" Пергалезі, нават праспявалі мы творы Уэбера, сучаснага англійскага кампазітара. Там многа прыгажосцей, магчыма, што семінарыстам гэта не найважнейшае, можа яны засяроджаны на малітве, аднак яны ўважліва слухалі і вельмі бурна апладзіравалі.

— Ваш хор каторы раз у Беластоку?

— Упершыню. У Гродне я яшчэ кірую Гарадской капэлай і з гэтай капэлай я была ў Беластоку тры гады таму назад.

— А ці бывалі Вы ў іншых замежных краінах?

— Мы былі ў Германіі, у горадзе Міндэн, гэта наш горад-пабрацім. Ездзілі таксама ў Даўгаўпілс у Латвіі...

— А ў Расіі бывалі?

— Былі ў Смаленску.

— Недалёка, у крывічоў. Яшчэ пастаўлю Вам пытанне сямейнага характару: Ваш муж служыць у царкве...

— Ён служыць у незвычайным храме, у вёсцы Мількаўшчына (каля дзесяці кіламетраў за Скідалем). Гэтую царкву пабудаваў архітэктар Канстанцін Шырма, адну з іх у Пецярбургу, там ваенны храм. У Мількаўшчыне царква была пабудавана ў 1904 годзе, у ёй незвычайная акустыка. Гэтая царква з'яўляецца архітэктурным помнікам, яна поўнасцю збудавана з чырвонай цэглы. А мой муж працаваў пры рэстаўрацыі гэтага храма, ён займаўся яго пабелкай, ён вярнуў у царкву іканастас. Там пастаянна адбываюцца службы, у якіх прысутнічае вельмі многа людзей. Мой муж Аляксандр Шашкоў укладвае вельмі многа сіл у царкоўныя справы. Да таго ж ён кампазітар, ён з'яўляецца членам журы Фестывалю царкоўнай музыкі, які ладзіцца ў Гродне.

— Мне не супадаюць Вашы прозвішчы...

— Я свайго прозвішча не мяняла, у мяне ж яно такое набожнае. Ён быў нават і меў ахвоту прыняць маё...

— А што Вы хочаце сказаць ад сябе, можа пра нешта, пра што я не падумаў?

— Я хачу вельмі падзякаваць спадару Міколу Бушко. Я яго знаю здаўна і бачу, з якой вялікай любоўю адносіцца ён да праваслаўнай музыкі і як ён ладзіць гэты фестываль. Колькі разоў ён званіў нам! Я заўсёды дзівуюся энергіі гэтага чалавека, ягонай унутранай сіле. Мы ж маглі сюды і не прыехаць, а ён папросту прымусіў нас. Бо ж былі складанасці з грашамі, былі клопаты з абменам пашпартоў, мы ж літаральна напярэдадні атрымалі два пашпарты. І гэтая настойлівасць, гэтае чаканне нас пакарыла; і мы тут.

Я яшчэ хачу сказаць пра Рамуальда Твардоўскага. У нас вельмі многа ягоных зборнікаў і мы вельмі любім ягоныя творы, мы праспявалі ўсю яго музыку. Я захапляюся гэтым чалавекам, яго працай над стварэннем гэтых твораў. Мы пачынаем развучваць іх і спачатку іх быццам не разумеем. Але чым больш спяваем — нават напярэдадні харысты прызналіся, што ім ягоны твор падабаецца больш за ўсе — чым далей ахопліваем красу ягонай музыкі, тым лепш яе разумеем.

— Зубрыць трэба, як матэматыку ці фізіку.

— Так, зубрыць, вывучаць. Гэтыя прыгажосці не адразу паказваюцца, іх трэба спачатку выдабыць, а толькі пасля раскашавацца.

— Вялікае Вам дзякуй.

Гутарыў Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Яркі і разнастайны свет — вачамі дзяцей

Выстава **„На сваёй зямлі"**, прысвечаная Міжнароднаму дню дзіцяці, з 1 чэрвеня 2010 г. адкрылася ў Культурным цэнтры Беларусі ў Польшчы (г. Беласток, вул. Модліньска, 2). Тут прапанаваны малюнкі юных аўтараў з Беларусі, Літвы, Расіі, Сербіі — усяго 19 краін. Аўтары выставы — пераможцы Міжнароднага дзіцячага мастацкага конкурсу „На сваёй зямлі", які арганізуецца грамадскім аб'яднаннем „Беларускі Зялёны Крыж" пры падтрымцы міністэрстваў культуры, адукацыі, прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь. Выставу ў Культурным цэнтры Беларусі можна агледзець на працягу чэрвеня ў будныя дні з 10.00 па 17.00 гадзіну. Сардэчна запрашаем!

Літаратурныя падарожжы

(польскамоўныя пісьменнікі на Берасцейшчыне)

VIII

У вёсцы Сачыўкі, што на Баранавіччыне, быў некалі маёнтак знакамітага шляхецкага роду Анцутаў. Сёння аб ім засталіся толькі ўспаміны ды літаратурныя сведчанні аб тым, што пэўны час гаспадыняй маёнтка была маці Ігната Дамейкі, знакамітага пісьменніка, падарожніка і вучонага.

Нарадзіўся Дамейка ў вёсцы Мядзвядцы, што ў Карэліцкім раёне Гарадзеншчыны. Але хрысцілі яго ў касцёле св. Юр'я ў Паланэчцы каля Сачыўкаў. Тут жыла бабуля, да якой ён часта прыязджаў з бацькамі. Сюды ён наведваўся юнаком, калі маці атрымала маёнтак у спадчыну ад брата.

Ігнат вельмі любіў прыроду, што акружала вёску, добра ведаў навакольле і кожны раз па-новаму быў уражаны яго прыгажосцю. Бачачы незвычайную любоў сына да мясцовых краявідаў, маці спадзявалася, што ён стане гаспадаром маёнтка, але лёс распарадзіўся па-свойму.

Як удзельнік студэнцкіх выступленняў, Ігнат Дамейка апынуўся ў выгнанні. Пасля працяглых бадзянняў па свеце ён пасяліўся ў Чылі, дзе завёў сям'ю, стаў вучоным, але радзіма ўвесь час маніла яго. І толькі ў 82-гадовым узросце ён наведае родныя мясціны, каб парадавацца сустрэчы з блізкімі, каб адслужыць жалобную месу па сястры ў касцёле вёскі Крошын (радзіма Паўлюка Багрыма) у Ляхавіцкім раёне.

Тут, у Крошыне, мясцовы шляхціц Завадскі прапанаваў Дамейку і Антону Эдварду Адынцу, які суправаджаў чылійскага госця ў паездцы, пасадзіць на памяць два дубкі. (Кажуць, што Дамейкаў расце дагэтуль.)

Пра сваё наведванне радзімы Дамейка расказаў у кнізе „Мае падарожжы", дзе з любоўю і пяшчотай перадаў свае ўражанні ад убачанага: „Вячэра ў гэты вечар была сямейная. Мы сядзелі яшчэ за сталом, калі пачулі спевы жней, што вярталіся з поля. Выйшлі на двор, дзе пачыналіся абходзіны дажынак. Там стаяў ужо доўгі стол, накрыты грубым абрусам. Ён быў застаўлены боханамі хлеба грубага памолу, сырам і бутэлькамі гарэлкі.

Прыгожая маладая дзяўчына ў вянку з жытніх каласоў на галаве падышла разам з дзвюма паважнымі жанчынамі па баках да мяне і пакланілася. Я зняў, згодна са звычаем, з яе галавы вянок і перадаў гаспадыні дома, пацалаваўшы жней".

Чатыры гады (1884-1888) правёў Ігнат Дамейка на радзіме, выязджаючы ў Італію, Турцыю і Палесціну.

Кожны раз, вяртаючыся дадому, быў вельмі ўсцешаны краявідамі роднага краю, дагледжанасцю маёнтка і сядзібы, сустрэчай з блізкімі.

У Чылі чакала сям'я. Настаў час пакінуць радзіму і ехаць у краіну, якую ён праславіў сваёй прысутнасцю, якой ён служыў, пашыраючы яе аўтарытэт у свеце.

У 1889 годзе Ігнат Дамейка адышоў у Вечнасць. Пахаваны ў Чылі.

(Працяг будзе)

Тамара ЛАЎРАНЧУК
г. Высокае

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Шосты фестываль песні

„Зорачкі”

Ужо шосты раз самаўрадавым садком № 14 у Беластоку праводзіўся Фестываль дзіцячай песні нацыянальных меншасцей Падляшша. Цяпер ужо не ў памяшканні садка па вуліцы Пілсудскага 20/4, бо там ужо проста надта цесна, каб столькі дашкольнікаў, нават толькі выступоўцаў, змясцілася! А прыязджаюць яны з усяго нашага рэгіёна — і з Беластока, і з Гайнаўкі, і з Бельска, і нават з далёкай поўначы ваяводства — аж з Пуньска! Вось сёння, 20 мая, давялося іх крышку пачакаць, пакуль даедуць, і спадарыня дырэктарка садка-арганізатара Луцыя Неміровіч разварушвала і засяроджвала сабраных малечаў, каб не гудзелі. А хто ж ім не дасць гудзець! Мала хто сядзіць ціхенька, як мышка, як пяцігадовая Марыся Пякарская, чакаючы свайго першага такога вялікага выступу! Папляскалі ў ладкі дзеткі, лічылі разам з паняй... І пачалося!

Вялікая сцэна ў Беларускім таварыстве ледзь змясціла такія вялікія гурты спевакоў як „Вясёлка” з садка № 14. Нават фотаапарат ледзь ахопіць гэтую вясёлую і таленавітую грамадку! Першай прагучала вядомая песня „Земляныя яблыкі”. Ад садка выступілі таксама салісты і дуэты — Мацько Цілюлька, Ася і Томак Мусюкі, Сярожка Раманюк, Кася Якімюк і вось Марыся Пякарская, якая адважна і прыгожа заспявала песню пра маму. З польскімі, беларускімі, украінскімі і рускімі песнямі выступілі дашкольнікі з беластоцкіх садкоў № № 32, 41, 58 і 8. З бельскага садка № 9 спявалі малойчыкі з „Лясной паляны” , а з Гайнаўкі — „Зорачкі” з садка № 5. Здаецца, самым вялікім гуртом былі тыя „Зорачкі”, якім вельмі ўдалай атрымалася песенька пра кошку і мышку, дзе дзяўчынкі падспеўвалі: „Пі-пі”, а „кіпцюрастыя” хлопчыкі: „Мяў!” — у цікавай інсцэніроўцы. А з сабой цэлае сцэнічнае афармленне прывезлі дашкольнікі з садка № 32, што праспявалі і паказалі беларускую „Купалінку”. Пуньскія прыгажунькі — Брыгіда Кракоўская, Лаўра Кагачэўская і Грэта Бобін, у нацыянальных літоўскіх строях, адважна і прыгожа заспявалі сваю песеньку, і атрымалі, як усе, харошыя ўзнагароды і дыпломы за ўдзел. Бо гэта не быў конкурс, толькі агляд, і ўсе былі ў выйгрышы — самыя добрыя спевакі, усе вылучаныя! А на канец заспявалі іхнія пані — настаўніцы з усіх садкоў, бо ўсе ведалі песню „Туман ярам”. І яны таксама перажывалі на сцэне! Вядома, перад такой публікай!

Марыся Пякарская

Мацько Цілюлька

Дзяўчаткі з Пуньска

Міра ЛУКША

Парад з беларускімі кветкамі!

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Калі праз беластоцкую вуліцу Ліпавую перамяшчаўся вясёлы парад, мы прыкмецілі дзяцей у беларускіх народна-эстрадных касцюмах. Вясёлая грамадка прыгожа вылучалася сярод тысячы ўдзельнікаў. Мова пра дзетак з Непублічнай школы імя Кірылы і Мяфодзія ў Беластоку, паўсюдна вядомай як *праваслаўная*.

— Хто з вас прыдумаў ідэю апрануцца ў беларускія строі? — пытаем у сімпатычнай настаўніцы Ірыны Троц.

— Неяк усе разам, — чую ў адказ. — Мы падумалі, што ў такі спосаб будзем больш прыкметныя...

І сапраўды! Нашая група атрымала вылучэнне ад улад горада за вынаходлівую прэзентацыю. У падобным стылі апрануліся яшчэ вучні балетнай школы. Тыя аднак прамавалі курпёўскія і мазавецкія касцюмы. Прыемна здзівілі беларускія акцэнты сярод вучняў адной прафесійнай школы. Мададыя ішлі з музыкантам, які на гармоніку падыгрываў мелодыі „Прымакоў”.

Каляровы парад дашкольнікаў, дзяцей, моладзі і дарослай ужо „кавалеркі” прайшоў 1 чэрвеня, у сонечны і ясны Міжнародны дзень дзіцяці. Цікава, што палову ўдзельнікаў складалі тыя найстарэйшыя: гімназісты, ліцэісты і вучні прафесійных школ.

ЗОРКА

Галерэя дэкламатараў „Роднае слова 2010”

Аляксандр Адзіевіч

Юлія Вакулеўская

Караліна Рашкоўская

Павел Савіцкі

Сураж

У чарговае падарожжа прапаную падацца ў Сураж — старадаўнюю мясцовасць ля ракі Нарвы.

Пачаткі Суража сягаюць ранняга сярэднявечча. Менавіта тады, у XI стагоддзі, калі гэтыя землі належалі да Кіеўскай Русі, паўстала тут гарадзішча з умацаваным горадам. Па сённяшні дзень аб багатым мінулым Суража сведчыць гэтае ж гарадзішча распаложанае непасрэдна ля ракі Нарвы. Не без прычыны паўстала яно тут, паколькі ў гэтым месцы людзі перапраўляліся праз раку.

У XV стагоддзі Сураж пераходзіць ва ўладанне Вялікага Княства Літоўскага і якраз у гэтым перыядзе наступіла буйнае развіццё мясцовасці. У 1445 годзе вялікі князь Казімір Ягелончык надаў Суражу гарадскія правы. У палове наступнага стагоддзя ўладальнікам Суража стала каралева Бона. Яна на замкавай гары пабудавала замак з вялікай вежай, у якой змяшчаліся вязніца і архіў. Цікава, што па сённяшні дзень у памяць уладальніцы жыхары Суража гарадзішча называюць „гарой каралевы Боны”. На жаль, падчас шведскага патопу замак быў цалкам знішчаны. Пасля Люблінскай уніі Сураж належаў ужо да Польскай Кароны.

Археалагічныя раскопкі вяліся на суражскім гарадзішчы ўжо ў пачатках XX стагоддзя. Паводле іх вынікаў, першапачаткова гарадзішча ў гэтай мясцовасці было на 10 метраў вышэй узроўню Нарвы, а навокал яго знаходзілася фоса. У сярэдзіне гарадзішча, яшчэ да пабудовы замка каралевы Боны, знаходзіліся драўляныя будынкі.

Сёння Сураж гэта невялікі гарадок, пра багатае мінулае якога сведчаць помнікі мінуўшчыны. Апрача гарадзішча варта наведаць рускі рынак, касцёл, але перш за усё Грамадскі археалагічны музей, які ў сваёй хаце вядзе краязнаўца Уладыслаў Літвінчук. Пабачыць тут можна старадаўнія прылады, кераміку ды этнаграфічныя экспанаты.

Міхась СЦЕПАНЮК

Музыка з кайфам

Сучаснікі

Калі часам адкрываецца перада мной белая старонка, якая чакае чарговых слоў і навін з музычнага беларускага свету, прызнаю, што бываюць моманты, калі зусім не ведаю да чаго вас заахвочваць. Здаецца, пра ўсё ўжо ў нашай рубрыцы пісалася, з другога боку ўвесь час узнікаюць новыя гурты, падзеі, адбываюцца канцэрты і фестывалі. Спасылаючыся на апошнія, сёння буду расхвальваць „Дні сучаснага мастацтва”. Мерапрыемства праходзіць у Беластоку ўжо чвэрць стагоддзя. За гэты час жыхары горада мелі магчымасць пазнаёміцца з цікавейшымі трэндамі ў мастацтве. Цэнтральнае месца ў праграме фестывальных дзён заўсёды займае тэатр. Прыязджаюць трупы з цэлай Польшчы і з-за мяжы. З году ў год колькасць прэзентацый расце, а выбар здаецца быць цікавейшым. Апрача тэатраў дэманструюцца фільм і музыка. Усе віды мастацтва вельмі часта пранікаюцца. На іх мяжы сёлета запрэзентаваліся таксама два беларускія гурты, што можам палічыць вялікім дасягненнем і вылучэннем.

З Мінска ў Беласток прыехаў гурт „Гурзуф”. Чытачы „Зоркі” павінны помніць Ігара і Арцёма, якія ў рубрыцы выступалі ў якасці гасцей. У гэты раз наведалі яны Беласток не дзеля звычайнага канцэрта, але каб стварыць гукавую карцінку да нямой кінастужкі „Голем” з 1920 года. Раней „Гурзуф” пісаў музыку для тэатра, а іх дэбютны альбом называецца „Неіснуючае кіно”. Сувязі з карцінамі, відаць, у іх шырокія. Далёка рухацца на фестываль не мудзіў другі беларускі гурт. Беласток прэзентаваў на фестывалі гурт „ILO&friends”, але ў новай для сябе форме. Звычайна гурт гэты канцэртуе самастойна, але ў гэты раз выступаў супольна з танцорамі студыі „DanceOFFnia”. Група сучаснага танца „Grupa Przejściowa” станцавала пад музыку гурту „ILO&friends” спектакль „Тоеснасць”. Варта адзначыць, што абедзве прапановы карысталіся ўвагай беластачан і прыхільнікаў фестывалю. Гэта пашырае цікаўнасць нашага грамадства да беларускай творчасці і паказвае, што ў беларускага мастацтва высокі ўзровень.

Каб дапоўніць аптымістычную карціну, дадам толькі, што ў той самы час, калі праходзілі „Дні сучаснага мастацтва”, адбыўся фінал чацвёртага выпуску акцыі „Прыпынак Маладыя” беластоцкага дадатка „Газеты выбарчай”, у якой чарговыя беларусы атрымалі вылучэнні. На гэты раз дыпломамі былі ўзнагароджаны фатограф Павел Гжэсь і вядомая чытачам „Нівы” маладая мастачка Оля Чарняўская.

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 24

Запоўніце клеткі беларускімі славамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў, дашліце ў „Зорку”. Тут разыйграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 20:

Твар, чапля, плечы, ток, сакрэт, вятрак, вір, ода, яма, толк, дзяк. Таз, сяло, апарат, крок, рад, аптэка, плот, лек, вяз, мяч, ім’я, брак.

Узнагароды, фламастры, выйгралі: **Адрыян Міхальчук, Адрыян Жукоўскі** з Дубін, **Паўліна Паплаўская** з Бельска-Падляшскага. Віншуем!



Ала ПЕТРУШКЕВІЧ

ШЛЯХАМ ЭЛІЗЫ АЖЭШКІ

Роўна сто гадоў мінула, як не стала Элізы Ажэшкі. Да гэтай даты і была прымеркавана падзея, што адбылася 17-18 траўня ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы, — навуковая канферэнцыя „Творчасць Элізы Ажэшкі ў эстэтычнай прасторы сучаснасці", зладжаная кафедрай польскай філалогіі пад кіраўніцтвам прафесара Святланы Мусіенкі сумесна з навукова-дыдактычным каардынацыйным цэнтрам „Міжнародны інстытут Адама Міцкевіча" і грамадскім аб'яднаннем „Польска мацеж школьна".

Як звычайна, у першы дзень — урачыстае адкрыццё, вітанне шматлікіх гасцей, навукоўцаў з многіх гарадоў Польшчы, пленарнае пасяджэнне. Навуковая імпрэза хораша спалучылася з ушанаваннем пісьменніцы, да помніка якой былі ўскладзены кветкі, з наведваннем музейнай экспазіцыі ў доме, які сёння гарадзенцы ведаюць як Дом Элізы Ажэшкі. А вечарам — урачыстая імша ў Бернардзінскім касцёле ў памяць пісьменніцы.

Другі дзень канферэнцыі — праца ў трох секцыях і поўная незабыўных уражанняў экскурсія па мясцінах, дзе праходзіў жыццёвы шлях паэткі, дзе жылі героі яе кніг. Ускладанне кветак да помніка на магіле пісьменніцы на старых гарадзенскіх могілках. Мількаўшчына — калыска Элізы Ажэшкі. На жаль, месца, дзе захаваліся толькі рэшткі сядзібы Ажэшкаў, не мае сёння гаспадара, пра яго клапоцяцца вучні і настаўнікі мясцовай школы, што носіць імя славутай зямлячкі, дзе створаны музей. Вельмі міла было слухаць выступленне вучняў, што ўяўляла сабой прыгожае сугалоссе беларускіх і польскіх моў.

Заключнае пасяджэнне было завершана цудоўнымі вершамі паэткі Любові Русілкі, выпускніцы гэтай школы, што непасрэдна спрычынілася да шанавання імя Элізы Ажэшкі: стварыла сапраўдны паэтычны эпас „Зямля і людзі", часткай якога — паэма „Алея Элізы".

Запалены знічы і ўскладзены кветкі і на радзінны могільнік, дзе пахаваны бацька пісьменніцы Бенедыкт Паўлоўскі, яе сястра Клемянціна.

А напрыканцы гэтых багатых на падзеі і сустрэчы дзён — шлях над Нёманам: да магілы Яна і Цэцыліі, да месца шанавання паўстанцаў 1863 года, у Багатырэвічы, Міневічы. Шлях, які яна не проста стварыла як займальны сюжэт свайго знакамітага рамана, а каб тутэйшыя людзі шанавалі сваё, каб мелі гонар як нашчадкі тых слаўных падзей.

Эліза Ажэшка — імя, заслужана шанаванае ў Гародні. Так было пры жыцці вялікай пясняркі Прынёманскага краю, калі адбыўся выпадак сапраўды беспрэцэдэнтны: клапоцячыся пра спакой для хворай пісьменніцы, гарадзенцы ўсцілалі саломай брук ля яе дому. Памяталі, як яна, выкарыстаўшы свой аўтарытэт у Еўропе, кінула кліч дапамогі пагарэльцам у пажары 1885 года. Тым самым вярнула людзям жыллё. А такое не забываецца.

Шануецца памяць пра яе і сёння. Цэнтральная вуліца горада носіць імя вялікай пісьменніцы. Заўважым, што ні адна ўлада не пасмела перайменаваць гэтую вуліцу. На сабраныя грамадой сродкі яшчэ ў 1929 годзе паўстаў помнік — першы ў нашым горадзе помнік дзеячцы літаратуры.

Эліза Ажэшка пакінула вялікую творчую спадчыну: каля двухсот твораў розных жанраў. Дом Элізы Ажэшкі ў Гародні на мяжы стагоддзяў стаў сапраўдным літаратурным салонам, месцам, якое вабіла прадстаўнікоў культуры розных нацыянальнасцей. І, безумоўна, беларусаў, да якіх вялікая пісьменніца нашага Краю і шчырая патронка для ўсіх гарадзенцаў мела вялікую прыхільнасць як да прыніжаных і абражаных, якія, аднак, мелі высокі чалавечы гонар, спрадвечную культуру, але жылі часта ў глыбокай паняверцы. Пра тое сведчаць лепшыя творы пісьменніцы, аповесці „Нізіны", „Дзюрдзі", „Хам". Як пісаў Уладзімір Содаль, „Ажэшка, як ніхто да яе, апавядала свету пра беларусаў і Беларусь. Яна для нашага краю, як Гогаль для Украіны. Той быў сувязным паміж Украінай і Расіяй, а яна — між Беларуссю і Польшчай".

Знакавым сёння бачыцца і той факт, што першым творам польскай літаратуры, змешчаным на старонках самай знакамітай беларускай газеты пачатку XX стагоддзя „Нашай нівы", стала апавяданне Элізы Ажэшкі „Гэдалі", што друкавалася з працягам аж у шасці нумарах (11-16). Можна толькі ўявіць, як наш вясковы люд, у тым часе не надта распешчаны вялікім выбарам культурнай інфармацыі, з нецярплівасцю чакаў працягу гэтага, сённяшняй мовай кажучы, цікавага серыяла пра жыццё ў нашым Краі, дзе пазнавальнымі былі тагачасныя тыпы руплівага гаспадара-працаўніка, маладых людзей, чые настроі былі скіраваны да ідэй дабра, справядлівасці.

Адзін з найцікавейшых аспектаў дзейнасці пісьменніцы — этнаграфічная праца, збор назваў раслін зямлі беларускай. У Элізы Ажэшкі вынікам гэтай працы сталі нарысы „Людзі і кветкі над Нёманам", апублікаваныя ў навукова-этнаграфічным часопісе „Вісла" ў 1888-1892 гадах. А яшчэ — цудоўныя кампазіцыі з зёлак, што праз стагоддзе захавалі сваю прыгажосць. Некаторыя з іх захоўваюцца ў музеях нашага горада. Эліза Ажэшка выкарыстала ў сваім нарысе 228 назваў раслін. Мэта, якую ставіла даследчыца, — паказаць, што ў гэтых народных назвах адлюстраваны сапраўдны духоўны скарб, паэтычнасць, спрадвечная мудрасць, розум, талент беларускага сялянства.

„Мы павінны сумленна працаваць і, наколькі гэта магчыма, сумесна. Каб праўдзіва паказаць і правільна ацаніць гэты асноўны грамадскі клас і гэтыя мільёны чалавечых істот, якія называюцца вясковым людам", — так сама Эліза Ажэшка вызначала сэнс сваёй працы.

У самой назве нарыса Элізы Ажэшкі („Людзі і кветкі над Нёманам") гучыць узнёслая паэзія. Тут — і надзвычайнае багацце краю над Нёманам, і вылучэнне найпрыгажэйшага ў прыродзе — кветкі. Але самае значнае — людзі, чалавек-творца, які здольны гэтую, на першы погляд, някідкую красу ўбачыць і як належыць ацаніць, апавіць у дасканалую моўную форму, дзе і сэнс — відавочны, і гучанне — музыка. А над усім найвышэй ужо ў назве адчуваем тое шчырае пачуццё любові, якую мела ў сваім сэрцы аўтарка і да гэтага краю, і да яго народа.

Людзі і ёсць тымі кветкамі зямлі, убачыць, разгадаць, раскрыць здольнасці, талент якіх можна толькі пры ўмове руплівай, стараннай працы. З гэтай думкі і пачынаецца нарыс: „Вывучэнне якіх-небудзь бакоў жыцця народа я параўнала б з выбіраннем жмені канапляных зярнят з бочкі маку". Незвычайнасць сітуацыі тут была найперш у тым, што яна — адукаваная пані, апынулася ў ролі вучня, яны ж — часцей непісьменныя, прыніжаныя вякамі няволі, станавіліся настаўнікамі. Эліза Ажэшка прапанавала цэлую методыку працы з беларускімі сялянамі, асновай якой найперш ёсць павага, тактоўнасць, шчырасць.

Самай яркай старонкай сяброўскага пабрацімства польскай пісьменніцы з дзеячамі беларускай літаратуры з'яўляецца яе сяброўства з Францішкам Багушэвічам, які неаднойчы бываў у доме Элізы Ажэшкі, меў з ёю шматгадовае ліставанне. Са скрухай успрыняла яна вестку пра адыход беларускага паэта. „Каралева жывога слова", „Каралева польскай прозы і пакутлівай праўды" — такія высокія характарыстыкі даваў пісьменніцы пачынальнік беларускага нацыянальнага Адраджэння. Аб глыбокай прыхільнасці паэта да вялікай гарадзенскай пані сведчыць верш-прысвячэнне Францішка Багушэвіча „Яснавяльможнай пані Арэшчысе", у якім ад імя беларускага люду, заўсёды шанаванага ёю, на ягонай „простай гаворцы" выказаў шчырую ўдзячнасць і пашану за тое, што заглянула ў хату беларуса і ўбачыла там чалавека, якім часта пагарджалі, працягнула яму руку і выліла на паперы смутак ягонай душы.

У многіх творах Элізы Ажэшкі (цыкл навел „Gloria victis", раман „Над Нёманам") знайшоў адлюстраванне водгук паўстання пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага, у якім непасрэдны ўдзел брала і сама пісьменніца, — „лёсазломны і лёсавызначальны час" (Анатоль Бутэвіч).

Упершыню цыкл навел „Gloria victis" выйшаў асобнай кнігай у Вільні ў 1910 годзе. Першапачатковая назва — „1863". „Аднак і канчатковая назва „Gloria victis", што азначае — слава пераможаным, не менш значная і сімвалічная. Самы глыбокі... сэнс хаваецца менавіта ў апошнім слове — *пераможаным*" (Анатоль Бутэвіч).

Матыў памяці ў навеле Элізы Ажэшкі „Gloria victis" займае цэнтральнае месца. Гэта памяць пра адну з самых значных падзей другой паловы XIX стагоддзя, што ўскалыхнула ўвесь Край, адбілася на ягоным лёсе і на лёсах многіх удзельнікаў паўстання пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага. Гэты першы пласт памяці, надзвычай шырокі, усеагульны, пераплятаецца ў творы з іншым, на якім вырастае асабісты, у эпіцэнтры якога перажытае аўтаркай, выпакутаванае, таму і пазначанае глыбокай эмоцыяй, таму і асабліва кранальнае. У гэтым, апошнім, на першы план выступаюць пачуцці вялікай любові — да тых духоўна блізкіх і дарагіх, каго ўжо няма, хто стаўся пераможаным. Матыў памяці падсвечваецца трагічным матывам страты, бо ўсё тое, светлае і велічнае, — знішчана.

Гэта быў першы твор, напісаны ўраджэнкай нашага Краю, дзе па-мастацку дасканала і па-жаночы эмацыйна-вытанчана былі асэнсаваны вынікі магутнага руху — духоўнага і ўзброенага Супраціву супраць нацыянальнага, палітычнага ўціску на пачатку 60-х гадоў XIX стагоддзя, непасрэднай удзельніцай якога была сама аўтарка. Цэнтральная навела „Gloria victis", што дала назву ўсяму цыклу, была створана яшчэ ў 1888 годзе да 25-годдзя паўстання, хоць да чытача прыйшла значна пазней, на пачатку XX ст.

Назвай і зместам свайго твора Эліза Ажэшка выказала нязгоду з гэтай замацаванай часам традыцыяй. Вядомае ад старажытных часоў „Vae victis" перамяніла на „Gloria victis", на ўслаўленне тых, хто пераможаны, тым самым сцвердзіўшы, што змаганне і вялікія ахвяры не былі марнымі. Тое ж сцвярджае і перакладчык Анатоль Бутэвіч: „Самы глыбокі... сэнс хаваецца менавіта ў апошнім слове — *пераможаным*. Так, няхай паўстанне не мела поспеху, хай палеглі і пайшлі па этапу ягоныя ўдзельнікі, ды слава іх — *пераможаных* — ад гэтага не цьмее і не становіцца меншай".

Навела „Gloria victis" — гэта яшчэ адзін помнік героям. Помнік любові і каханню. Помнік надзеям. Бо недарэмна ж паролем змагароў былі словы: „З надзеяй альбо насуперак надзеі!" Помнік, які змагла паставіць пісьменніца, што да канца сваіх дзён пранесла ў памяці велічныя ідэалы паўстання. Пэўная адлегласць у часе кампенсуецца не толькі выключнай памяццю, але і пачуццём абавязку — расказаць пра сваё разуменне, данесці сваю праўду аб тых падзеях. Бо тое паўстанне на нашай зямлі — гэта велічная і трагічная старонка, што павінна застацца не толькі ў гісторыі, але і ў свядомасці людзей як прыклад змагання за волю.

Сто гадоў таму „Наша Ніва" адгукнулася на трагічную вестку з Гародні. Ужо ў № 20 ад 13 траўня быў апублікаваны прачулы артыкул Вацлава Ластоўскага пра сыход вялікай польскай пісьменніцы. Аўтар адзначае: „Яе сьмерць — гэта страта ня толькі Польшчы, ня толькі польскага народу, для каторага яна працавала, але і ўсяго культурнага сьвету: Эліза Ажэшка ў мнагалетняй сваёй працы старалася перш за ўсё шырыць у сваім грамадзянстве ідэалы і думкі агульналюдскія, старалася будзіць міласць да нешчаслівых і пакрыўджаных жыццём, міласць да чалавека".

Вацлаў Ластоўскі падкрэслівае еднасць пясняркі з беларускім краем, беларускім людам: „Большая часьць твораў Элізы Ожэшковай, як і сама душа пісьменьніцы, неразрыўна зьвязана з беларускай глебай; у повесьцях Ожэшковай бачым у пекных малюнках абразы нашай старонкі..."

Не без болю і наракання зважае аўтар на тую акалічнасць, што многія ўзгадаваныя гэтай зямлёй творцы аддавалі свой талент іншым народам, культурам. Адвечная несправядлівасць — траціць сваё, лепшае з-за забароненай мовы і страчанай дзяржаўнасці — для Беларусі сталася ўжо наканаваннем: „Праўдзівай бацькаўшчынай Ожэшковай была Беларуская зямля, каторая яе ўзгадавала; з Польшчай — апрача мовы і гістарычных перажыткаў — вялікая пісьменьніца мела мала супольнага. І ўсё-ж такі беларуская фантазія, беларуская казка, што рожавай дымкай апавіла яе дзіцячыя думкі, ускалыхала вялікага духа пакойнай на славу чужым. Такая ўжо, відаць, доля нашага краю..."

Эліза Ажэшка аддала свой талент найперш нашаму Краю, ягоным людзям, раздзяліла з імі свой лёс. Таму і шануецца сёння на нашай зямлі.

ТУТ І НАДАЛЕЙ ЗАХОЎВАЕЦЦА БЕЛАРУСЬ

(Аб вандроўцы сяброў Таварыства беларускай культуры ў Літве на Беласточчыну)

Часта разважаючы аб мінулым і сучасным свайго народа, задумваюся, а ці да канца спазнаў яго шляхі, яго гісторыю, сучаснасць... Бо для таго, каб зразумець яго, недастаткова ведаць толькі мінулае, але і сённяшняе, яго шляхі і быццё на сучасным адрэзку часу. І, думаю, многія пагодзяцца, што нягледзячы на слаўнае, велічнае, бурнае мінулае, сучаснасць яго сумная. Мы знаходзімся ў тым часе, калі беларускі народ прыйшоў у заняпад, зрокся сваёй мовы, традыцый, каранёў. Да гэтага ўсяго яшчэ дабаўляюцца і слабыя веды аб сучасных беларусах, іх лёсе, жыцці, бачанні свету, перазахоўваемых традыцыях, мове, гаворках. І можа зараз настаў час не плакацца аб трагічным быцці беларусаў, аб іх знікненні, а пераасэнсаваць сучасны стан і паспрабаваць як мага найбольш захаваць Беларусі для нашчадкаў. Так, яна зрусіфікаваная. Але засталіся астраўкі беларускасці, да гэтага часу маладаследаваныя, ці малавядомыя, якія варта было б прыўзняць з паўзабыцця, заняцца іх папулярызацыяй і вывучэннем іх матэрыяльнай і духоўнай культуры, каб будучым пакаленням як паўней перадаць Беларусь. І адным з такіх астраўкоў, безумоўна, з'яўляецца Падляшша на Беласточчыне, на якім, нягледзячы на шматлікія неспрыяльныя ўмовы, перш за ўсё паланізацыю, вельмі добра захаваўся беларускі свет. Знаёміцца менавіта з Падляшшам выправіліся сябры Таварыства беларускай культуры ў Літве 22-23 траўня.

Гэта была наша традыцыйная вандроўка, бо кожны год ТБК наведвае розныя мясціны, звязаныя з беларусамі.

Нашым першым пунктам, дзе мы спыніліся, быў Беласток. Варта адзначыць, што пэўны час ён належаў да Беларусі, калі ў 1939 г. быў заняты савецкімі войскамі і далучаны да БССР. Пасля заканчэння Другой сусветнай вайны яго зноў перадалі Польшчы.

Можна сказаць, што ў Польшчы Беласток з'яўляецца беларускім цэнтрам. Тут выдаецца тыднёвік беларусаў Польшчы „Ніва", адсюль вяшчае Радыё Рацыя, у Беластоцкім універсітэце працуе кафедра беларускай культуры, у горадзе маецца дзіцячы садок, школа і гімназія, дзе вывучаецца беларуская мова.

У офісе Радыё Рацыя адбылося наша знаёмства з беларусамі Беластока, якія кораценька распавялі пра сябе і пра справы, якімі яны займаюцца. Прысутнічалі Яўген Вапа, Ганна Кандрацюк, Барбара Пякарская (старшыня АБ-БА), Алег Латышонак, прафесар Яўген Мірановіч, Міра Лукша і інш.

Барбара Пякарская распавяла аб беларускім жыцці Беластока. Яна адна з тых, хто займаецца арганізацыяй беларускага школьніцтва ў гэтым горадзе. Сёння ў Беластоку, як яна адзначыла, маецца беларуская група ў дзіцячым садку. І калі напачатку былі цяжкасці з наборам дзяцей, то зараз існуе іншая праблема: прыняць усіх жадаючых. На дадзены момант беларускі садок наведвае каля 100 дзяцей. Асноўная праблема ў іх — узровень валодання беларускай мовай. Як правіла, ён нізкі, а таксама большасць дзяцей ведаюць не літаратурную мову, а мясцовы падляшскі дыялект.

Востра стаіць праблема змяншэння беларускага насельніцтва на Беласточчыне, аб чым і распавялі прысутныя. І тут яскрава акрэсліваюцца дзве прычыны змяншэння беларусаў: паланізацыя мясцовага насельніцтва і натуральны дэмаграфічны працэс, выміранне вёсак, у якіх у сваёй асноўнае масе і пражываюць беларусы. Многіх таксама непакоіла праблема перапісу насельніцтва, які адбудзецца ў Польшчы ў наступным годзе. Колькі застанецца беларусаў? Пры перапісе будзе дадзена магчымасць чалавеку пазначыць дзве нацыянальнасці, асноўную (кім лічыць сябе чалавек, ці хоча лічыць) і дадатковую (паходжанне, карані і г.д.). І гэта таксама можа спрычыніцца да таго, што шмат хто з раней запісаўшыхся беларусаў будзе зараз асноўнай нацыянальнасцю выбіраць польскую, а беларускую другаснай. Хаця можа адбыцца і адваротны працэс. Час пакажа.

Частка групы перад царквой у Супраслі

Алег Латышонак у часе дыскусіі зазначыў, што не трэба плакацца па спаланізаваных беларусах і не трэба думаць, як іх навярнуць да беларускасці, яны ўжо страчаныя. Лепей захаваць гэтых беларусаў, якія сёння яшчэ сябе свядома вызнаюць беларусамі.

Належыць адзначыць, што арганізацыяй нашай вандроўкі па Падляшшы займаўся Яўген Вапа, які змог паказаць не толькі самыя цікавыя ці важныя для беларусаў мясціны Падляшша, але ў сціслы тэрмін (два дні) вельмі шырока прадставіў свой рэгіён і мы змаглі ўбачыць цэласнасную карціну тэрыторыі, дзе кампактна пражываюць беларусы.

Першым месцам, куды мы накіраваліся, быў Бельск-Падляшскі. Нас сустрэлі ў Бельскім беларускім ліцэі імя Браніслава Тарашкевіча. Гэта было першае месца, дзе мы былі ўражанымі. Сапраўды, нават і не думалася, што на такім узроўні тут захавалася беларускасць. Нас прынялі і пазнаёмілі з ліцэем, школай і гімназіяй іх дырэктары Андрэй Сцепанюк і Васіль Ляшчынскі. Пры ўваходзе ў ліцэй нас прывіталі Пагоня і бел-чырвона-белыя сцягі. Практычна, з першых крокаў стала зразумела, што школа выхоўвае сваіх навучэнцаў у беларускім нацыянальным духу і на ідэалах БНР.

У кабінеце беларускай мовы вісіць фотаздымак першага Урада БНР. Як адзначыў дырэктар ліцэя, паважаны спадар Андрэй Сцепанюк, у Беларусі не знойдзеш такой навучальнай установы, дзе ў класе на стэндзе быў бы здымак Урада БНР. Побач — здымкі генарала Булак-Балаховіча і яго атрада, выявы герба Пагоні, фрагмент карціны Яна Матэйкі „Грунвальдская бітва" і шмат іншага. Афармленнем займаўся Міраслаў Здрайкоўскі, фінансавала — Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі Польшчы.

Гісторыя ліцэя пачынаецца з 1949 г., калі на Беласточчыне ствараліся беларускія школы. Адным з дырэктараў, якія спрычыніліся да развіцця школы і ліцэя, яго захавання быў Яраслаў Кастыцэвіч (1896-1971). Ён быў другім дырэктарам. Паходзіў з патомнай сям'і праваслаўных святароў. Нягледзячы на тое, што сам размаўляў па-расейску, прыкладаў усе намаганні, каб вучні ведалі беларускую мову і не забываліся пра свае карані. У 1965 г. бельская школа была рэарганізавана і падзелена на падставовую школу і ліцэй. У 1969 г. ліцэю было прысвоена імя Браніслава Тарашкевіча. У 2000 г. была адчынена беларуская гімназія. Такім чынам зараз падставовая школа, гімназія і ліцэй знаходзяцца пад адным дахам. На сённяшні дзень у іх 34 класы, у якіх навучаецца каля 1200 вучняў (у Польшчы ў беларускіх школах на дадзены момант навучаецца каля 4000 вучняў). За сваё існаванне ліцэй выпусціў 4980 вучняў. Трэба адзначыць, што ў Польшчы сярэдняя адукацыя складаецца з падставовай школы (6 класаў) + гімназія (3 класы) + ліцэй (3 класы).

Навучанне ў школе ў асноўным адбываецца на польскай мове з абавязковым вывучэннем беларускай мовы і некаторых прадметаў па-беларуску. Экзамен па беларускай мове з'яўляецца абавязковым. Не здаўшы яго, выпускнік не атрымае атэстата аб сярэдняй адукацыі. І, як адзначыў сп. А. Сцепанюк, калі адбываецца ў школе экзамен па беларускай мове, сюды з'язджаюцца ўсе мас-медыі, бо для Польшчы вялікая рэдкасць, калі акрамя дзяржаўнай мовы абавязкова здаецца і іншая.

Сам жа ліцэй уваходзіць у першую пяцёрку лепшых школ ваяводства. Гэта, па словах дырэктара, спрычыняецца да таго, што бацькі сваіх дзяцей ахвотна аддаюць у беларускую школу. Колькасць паступленняў выпускнікоў у вышэйшыя навучальныя ўстановы складае каля 90%.

Школу вельмі непакоіць зрусіфікаванасць самой Беларусі. Маецца квота для паступлення выпускнікоў школы ў ВНУ Рэспублікі Беларусь, але ёй не вельмі карыстаюцца, дый само кіраўніцтва не вельмі хоча туды пасылаць дзяцей, бо, як паказала практыка, дыпломы трэба настрыфікаваць.

Падручнікамі школу ў поўным аб'ёме забяспечвае польская дзяржава, таму ў іх няма неабходнасці атрымліваць такія з Беларусі. Такім чынам беларуская школа ў Бельску цалкам незалежная ад афіцыйнай палітыкі Рэспублікі Беларусь, што не перашкаджае ёй выхоўваць сваіх дзяцей беларусамі і на ідэалах БНР.

На развітанне кіраўніцтва школы накрыла нам шыкоўны стол, дзе мы яшчэ пэўны час размаўлялі, дзяліліся сваімі ўражаннямі.

Пасля Яўген Вапа паказаў нам беларускія вёскі Падляшша, у некаторых з іх мы спыніліся. У цэнтры кожнай вёскі вісіць шыльда, дзе прадстаўлена яе кароткая гісторыя. Тут належыць адзначыць тое, што на кожнай з іх інфармацыя прадстаўлена на трох мовах: беларускай, польскай, англійскай. Цікава, ці ўбачыш сёння ў Беларусі такія шыльды, каб на іх было што-небудзь напісана па-беларуску.

Начлег для нас быў арганізаваны на аграсядзібе ў спадара Міхала Філяновіча ў в. Скарышэва. Спадар Міхал з'яўляецца шчырым беларусам з разуменнем свайго паходжання і каранёў. Тут варта адзначыць, што ў навакольных вёсках пражывае выключна беларускае насельніцтва. Для ілюстрацыі беларускас-

працяг ☞10

9 ☞працяг

Тут і надалей захоўваецца Беларусь

ці спадара Міхала варта прывесці той факт, што жонка ў яго полька з-пад Варшавы, але размаўляе на беларускай мове.

Спадар Філяновіч захоплены вывучэннем сваіх каранёў. І ён сабраў невялікі музей, у якім прадстаўлены цікавыя і вельмі каштоўныя экспанаты і дакументы датычныя гісторыі вёскі і рэгіёна. Як сам ён зазначыў, у яго музеі няма экспанатаў маладзей за 1945 г., такіх ён проста не збірае. Уражвае не толькі колькасць сабранага матэрыялу, але і яго шырыня. Тут мы ўбачым і прадметы сялянскага быту, і шляхецкага, і аблачэнне святароў, і беларускія нацыянальныя строі, і ручнікі, і вышыванкі, і кнігі, і перыядычны друк, і грошы розных часоў, і музычныя інструменты…

Тут, на аграсядзібе, да нас далучыла Ганна Кандрацюк. І на наступны дзень, разам з Яўгенам Вапам яны працягвалі знаёміць нас з беларускім светам Падляшша.

У Гайнаўцы мы наведалі беларускі музей і беларускую бібліятэку. Да заснавання музея шмат спрычыніўся Канстанцін Майсеня (1923-2006). Ён, займаючы адказныя пасады ў Гайнаўцы, увесь час дапамагаў беларускаму насельніцтву, ствараў для іх працоўныя месцы. Тут трэба адзначыць такі момант, што ў пасляваеннай Польшчы да беларусаў палякі ставіліся вельмі кепска. Толькі за тое, што ты беларус, цябе не бралі на працу, не дазвалялі ў горадзе на базары прадаваць сельскагаспадарчую прадукцыю і г.д. І вось спадар Майсеня гэтаму супраціўляўся. І сёння, як памяць аб гэтым чалавеку, застаўся беларускі музей у Гайнаўцы. Музей мае даволі вялікую плошчу і там прадстаўлены традыцыйны свет беларуса Падляшша, селяніна, які жыў, працаваў на сваёй зямлі і перадаваў наступным пакаленням мудрасць сваіх продкаў.

У Гайнаўцы знаходзяцца беларускія ліцэй і гімназія. Падставовай сумеснай школы няма. Але ва ўсіх падставовых школах Гайнаўкі і ваколіц вывучаецца беларуская мова і вучні ў гімназію прыходзяць ведаючы яе.

Для школ як Гайнаўкі, так і Бельска, існуе праблема з беларускай мовай. Дзеці, якія прыходзяць у іх, ведаюць, як правіла, мясцовы дыялект (гаворкі), але не ведаюць літаратурнай беларускай мовы і таму іх трэба перавучваць. У вёсках, у бабуль, яны чуюць гаворку, а размаўляць на літаратурнай мове практычна няма з кім. І толькі ў школе гэтая праблема выпраўляецца. Тут варта дадаць, што падляшскі дыялект адзіны з беларускіх, які захаваў дыфтонгі. У гэтым яго вялікая каштоўнасць.

Вяртаючыся ў Бельск, мы наведалі Музей Малой Айчыны ў Студзіводах Дарафея Фіёніка. Гэта яшчэ адзін шчыры і самаадданы жыхар Падляшскай зямлі, які актыўна спрычыняецца да яе захавання і папулярызацыі. Ім і пры яго непасрэдным удзеле выдаюцца кнігі па гісторыі Падляшша, выдаюцца

Сустрэча ў Бельскім ліцэі з дырэктарам Андрэем Сцепанюком

кампакт-дыскі з традыцыйнымі спевамі гэтага рэгіёна. А самае галоўнае, ён стварыў два музеі: сялянскую і мяшчанскую сядзібы, дзе прадстаўлены адпаведна, сялянскі і мяшчанскі свет Бельшчыны. У сялянскай сядзібе на дадзены момант была прадстаўлена выстава разьбяра з Беларусі Мікалая Тарасюка. У яго разных кампазіцыях зафіксаваны адышоўны традыцыйны свет роднай вёскі, з яе абрадамі, як вяселле, выезд маладых, дзяленне каравая, паховіны і г.д. Разьбяра вельмі непакоіць факт занядбання беларускай вёскі і яе паміранне. Як каля адной з кампазіцый сам напісаў, што сядзіць зараз і плача, бо было 46 хат, а зараз застаўся толькі ён адзін.

Падляшша ўразіла сваёй захаванасцю традыцыйнага свету. Нягледзячы на тое, што зараз XXI стагодзе і большасць з нас жыве ў матэрыяльным свеце гарадской цывілізацыі, тут жыхары працягваюць жыць у свеце патрыярхальнай вёскі, спалучаючы ў сабе праваслаўныя традыцыі і абрады з язычніцкімі, захоўваючы мову сваіх продкаў, перадаючы маладому пакаленню свае традыцыі. Хацелася б звярнуць увагу даследчыкаў беларускай старажытнасці на гэты рэгіён з тым, каб яны яшчэ паспелі зафіксаваць гэты традыцыйны і патрыярхальны свет беларусаў у Польшчы і тым самым папоўніць скарбніцу беларускай культуры, якая яшчэ да канца не толькі не вывучана, але і не сабрана.

Уражвае таксама і выгляд беларускіх вёсак Падляшша. Паўсюль чысценька, прыбрана, шыкоўныя дамы (калі параўноўваць з вёскамі з Рэспублікі Беларусь). І становіцца зразумела, якую карысць нам прынесла савецкая ўлада і калгасны лад… Тут варта дадаць яшчэ і той факт, што практычна ва ўсіх вёсках праведзена каналізацыя, у хаты праведзена вада, аб чым у вёсках Рэспублікі Беларусь яшчэ даводзіцца марыць.

І напрыканцы хацелася б падзякаваць арганізатарам вандроўкі за цудоўнае падарожжа па краі беларусаў, за знаёмства з беларусамі, якія пражываюць па-за межамі сучаснай Рэспублікі Беларусь і за тое, што дзякуючы ім з'явілася надзея, што Беларусь не загіне, яна вечная, неабсяжная, неабдымная і яшчэ да канца не вывучаная і не спазнаная.

Алесь АДАМКОВІЧ
Вільня, 27 траўня 2010 г.

Беларускія праваабаронцы заўсёды сустракаліся з негатыўным стаўленнем да сябе з боку лукашэнкаўскай улады. Правы чалавека ў сучаснай Беларусі — гэта нешта незразумелае, непатрэбнае, а тых, хто заклікае да іх абароны, улады імкнуцца паліць брудам, вінаваціячы ў нейкім наймітстве. Відаць, менавіта таму ў гэтай краіне няма нават такой пасады як амбудсмен — незалежны ад урада абаронца правоў чалавека, які ў той жа час з'яўляецца дзяржаўным служачым. Але, як кажуць, песню не задушыш, нават калі „спяваць" яе прыходзіца з замежжа.

У сталіцы Літвы дзейнічае так званы „Беларускі дом правоў чалавека ў выгнанні" (беларускі ДПЧ). Асноўная мэта яго існавання — дапамога беларускім праваабаронцам ў вырашэнні праблем са свабодай сходаў і самавыражэння. ДПЧ дае месца для правядзення трэнінгаў, сустрэч, культурніцкіх мерапрыемстваў праваабаронцам, недзяржаўным і міжнародным арганізацыям , журналістам, студэнтам, выкладчыкам.

Каб бліжэй пазнаёміцца з гэтым домам, варта зазірнуць на яго сайт, што месціцца па адрасе **http://humanrightshouse.org/Members/Belarus.** Паколькі сайт мае дзве моўныя версіі — англійскую і беларускую, то для тых, хто валодае хаця б адной з іх, уверсе з правага боку размешчаны адпаведны „пераключальнік".

Даны сайт не існуе сам па сабе. Ён з'яўляецца часткай міжнароднай сеткі „Дамоў правоў чалавека", якія маюцца не толькі ў Еўропе, але і ў Азіі, і Афрыцы. Пра гэта, прынамсі, сведчыць карта, што размешчана таксама з правага боку галоўнай старонкі, але ўнізе.

Галоўная старонка падзяляецца на дзве часткі. Левая, шырэйшая, месціць апошнія навіны па праваабарончай тэматыцы, датычныя Беларусі. Прыемна бачыць, што ўладальнікі сайта клапоцяцца і пра візуальнае адлюстраванне навін — кожнае паведамленне суправаджаецца якім-небудзь фотаздымкам альбо адпаведным графічным малюнкам.

Выйсці да рубрык сайта знаходзяцца ўверсе выяўлення. Іх не вельмі многа і іх анансаванне таксама можна знайсці на „прасторах" галоўнай старонкі.

Кіраўніцтва ДПЧ лічыць важным распавесці пра фінансавы бок сваёй дзейнасці. Каб даведацца, пра тое, хто падтрымлівае беларускіх праваабаронцаў у выгнанні, трэба зайсці на старонку „Пра беларускі ДПЧ" у падрубрыку „Спонсары і ахвяраванні". На той жа старонцы можна пазнаёміцца з фільматэкай арганізацыі, дзе знаходзіцца калекцыя дакументальных фільмаў, створаных беларускімі і замежнымі рэжысёрамі, прысвечаных правам чалавека, гісторыі Беларусі, культуры і іншым тэмам.

Вартая інфармацыя для тых, хто сутыкаецца з парушэннем уласных правоў, месціцца ў рубрыцы „Партнёры". Там даецца даволі немалы пералік арганізацый, якія займаюцца праваабарончай дзейнасцю, указваюцца іх адрасы і тэлефоны.

Вядома, што кожная грамадская дзейнасць і прававая абарона, у прыватнасці, немагчымая без апелявання да шырокіх колаў грамадства. Без зваротаў і адозваў тут ніяк не абыйдзешся. На старонцы „Звароты" размешчаны дакументы, якімі беларускі ДПЧ імкнуўся прыцягнуць увагу сусветнай грамадскасці да парушэнняў правоў чалавека ў Беларусі.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь,беларусы…

Подых мундыялю

На гэтым тыдні ў пятніцу стартуе чарговы чэмпіянат свету па футболе. Кожны заўзятар асабіста гэта перажывае па-рознаму. Для адных, самых юных, першынство будзе як сапраўднае адкрыццё гульні нумар адзін на свеце. Для іншых — відовішча ацэніцца з крытэрыю ўбачанага за дзесяцігоддзі. Тут у кожнага свой пункт адліку. Аўтара гэтых радкоў памяць адсылае да 1978 года. Аднак чэмпіянат у Аргенціне (дзе на той час лютавала страшная дыктатура, а мы захапляліся відовішчам на зялёных газонах) тады ў Савецкім Саюзе паказвалі мала. А вось наступны мундыяль у Іспаніі дагэтуль застаецца ў мяне самым яркім спартовым дзействам у жыцці. Пасля таго прайшло яшчэ 6 футбольных форумаў, але 1982 год дагэтуль помніцца найбольш. А вось першынство, якое праходзіла ў 2002 годзе ў Азіі было безнадзейна сапсавана некваліфікаваным арбітражам і пакінула сумныя ўспаміны. Ёсць нядобрае прадчуванне, што і ў Паўднёвай Афрыцы зараз ровень судзейства будзе не найлепшы. Тым больш, што ФІФА ўпарта адмаўляецца ўводзіць сучасныя электронныя формы прагляду спрэчных сітуацый. На маю думку дарма. Безумоўна, поўнай справядлівасці не дабіцца ніколі. Але, прыкладам, у хакеі, практычна выключана пытанне быў гол, ці не. Дасканалая тэхніка і дадатковы арбітр не пакідаюць сумненняў. У футболе ж іначай, хутчэй усяго ўпартасць функцыянераў тлумачыцца проста — нежаданне змагацца з карупцыяй. Такі ўжо зараз свет. І ўсё ж хочацца верыць у чыстае дзейства менавіта на чэмпіянаце свету, дзе сабраныя лепшыя дружыны планеты. Ні Беларусь, ні бліжэйшыя краіны-суседзі туды не трапілі, таму кожны выбірае сабе каманду перажывання паводле густу, нацыянальных ці эстэтычных пераваг. А іншыя вызначаюцца ўжо падчас гульняў, калі выяўляюцца тыя ці іншыя якасці зборных. Паводле апытанняў бальшыня беларусаў будзе хварэць на гэты раз за Англію. Традыцыйна шмат прыхільнікаў Італіі, Аргенціны, Нідэрландаў, „вырасла" Іспанія, а вось Бразілія і Францыя крыху „ўпалі". Словам, у прыярытэце найперш моцныя футбольнага свету, гранды і пераможцы. Аднак, знойдзецца нямала і тых, хто будзе хварэць і за малыя краіны — Славаччыну, Славенію, тых, хто здзейсніў невялічкі спартовы подзвіг і сапраўды парадаваў сваю нацыю.

Футбольны чэмпіянат Беларусі на месяц натуральна адыдзе на другі план. А пакуль 12 тур прынёс новы рэкорд, які ўсталяваў БАТЭ. У бягучым чэмпіянаце барысаўцы пакуль не прапусцілі ні гола. 12 гульняў — 0 галоў у сваю браму! Чарговай ахвярай стала жодзінскае „Тарпеда", якое БАТЭ, праўда, перамог сціпла — 1:0. Ранейшае дасягненне сямігадовай даўніны — 11 „сухіх" матчаў — належала „Гомелю". Вынікі астатніх сустрэч: „Шахцёр" (Салігорск) — „Дынама" (Брэст) — 2:0, „Дынама" (Мінск) — „Белшына" (Бабруйск) — 3:0, „Дняпро" (Магілёў) — ФК Мінск — 1:5, „Партызан" (Мінск) — „Нафтан" (Наваполацк) — 1:1, ФК „Віцебск" — „Нёман" (Гродна) — 2:2. У гродзенцаў галавым дублем адзначыўся Дзмітрый Кавалёнак, які выратавальны для сваёй каманды мяч забіў ажно на 92-й хвіліне. Кавалёнак выйшаў у лідары сярод бамбардыраў — 7 галоў. У табліцы наперадзе барысаўцы — 28 ачкоў, тры клубы „Мінск", „Белшына" і „Дынама" (Мінск) маюць па 23 пункты. Берасцейцы з 15-цю ідуць на 6-м месцы, гродзенцы з 11-цю на 10-м.

Наперадзе месяц, будзем спадзявацца незабыўнага відовішча, сумленнага змагання розных школ і стыляў, шчырага захаплення і праведнага абурэння. Прыйшоў мундыяль!

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

НІНА — „КРАЎЧЫХА”

Ніна Хлябіч памерла ў красавіку гэтага года

Каля белай хаткі Ніны Хлябіч — славутая студня з цудоўнай вадой. Вада чыстая, крынічная цячэ пад чырвоным дашком, можа і не цудадзейная, ды хто едзе і хто ідзе — той вадзіцы набярэ. Добрая вада — ад добрага чалавека. У бок Рыбакоў Міхалоўскай гміны вядуць дарогі як да возера, якое накрыла пяць іншых вёсак. Рудні няма, Лукі няма, няма Боўтрыкаў... А Рыбакі засталіся напачапочку. І людзі засталіся тут тыя, што захоўваюць памяць, такія як Марыся Хлябіч, родам руднянка, як Віктар Бура, што непадалёк ад акуратнай хаціны абабітай белым сайдынгам мае сваё роднае котлішча. А падворкі ў рыбакоўцаў — некаторыя па абодва бакі дарогі, як у Віктара ці Ядзі, што родам з Цісоўкі, або іначай — на другім баку ад хаты Ніны, амаль насупраць — вялікі, харошы карычневы дом Фёдара Хлябіча. Цяпер няма дзядзькі Хлябіча, што пару гадоў таму адышоў на Каляды ў 95 гадоў, ад пару дзён няма і суседкі Ніны... Усюды зайсці можаш, і ўсюды цябе прывітаюць як сваяка.

Калі я трапіла была ў адчыненыя дзверы хаты Ніны Хлябіч, перамоклая ад першага асенняга дажджу, гаспадыня з ходу прывітала мяне як добрую знаёмую. Якраз адпачывала, ляжала на ложку, запускала сабе ў вочы кроплі. Што зробіш — баляць. Ды як перастанеш шыць! Абшывала ж Ніна пару гмін! Нядаўна была ў Нараўцы, расказвала, дык старыя кліенткі пазналі адразу на вуліцы. Памяталіся Нініны модныя і моцныя сукенкі, спадніцы, сачыкі. Ніна тады ўжо не гаспадарыла, кароўкі не трымала, корпалася крыху ў агародчыку. Добра, што сыны са свету вярнуліся — адзін, Лёнік, на возеры працуе, другі вярнуўся з Ольштына, купіў сабе кватэру на бандарскім „аседлі”. Сыны харошыя — Лявон, Ян, Аляксандар. І ўнукі добрыя, бабулю наведваюць.

— Па малако хаджу, ты бачыла, туды, дзе той сад вялікі. Да Ядзі. Ядзіны дочкі працуюць у доме апекі ў Гарбарах, у кухні. Мае крыху нашых людзей занятак у „гатэлі”. Там тыя жыхары не маюць кепска. Напэўна не галодныя. Учора, ідучы ў лясок па дручок, сустрэла я вельмі спраўную, прыгожую кабету. Пытаюся, як у яе справы. Кажа, хораша, ды ў сваім доміку найлепш. Мабыць, дзяцей яна сваіх і не мела. Цяжка самому. Я адна тут жыву, а ў кастрычніку, лістападзе еду зімаваць да сыноў. Здароўе не тое, што ў маладыя леты...

У Рыбаках цішыня. Або мчацца машыны — туды-сюды, але па-за клунямі, бо ж аб'езд зрабілі. У адведкі едуць да некаторых жыхароў дома апекі, іншых пазабывалі, здаўшы пад дзяржаўны дах. А пад Нініну хату — найчасцей пешшу заходзяць. Па ваду. Ніне было цяжка ўжо хадзіць, дык і ёй набіралі з яе студні вядзерца, прыносілі на парог. — Машын поўна, прыязджаюць сюды шукаць цішыні і адпачынку. І штораз іх больш. І на беларускія фэсты едуць, тыя больш нетутэйшыя цікавяцца нашым. А што тут новага... Народ з рэнтаў жыве. Ні збожжа хто пасее, ні што пасадзіць... Ледзь дзе якую клетачку пасеяную ўбачыш. Адно сумны пералік: вось памерла Ліда з Ціванюкоў, Мірак Андраюк, у сорак шэсць гадоў, такі майстар быў... Я вось адным вокам ужо добра не бачу... Трэці год. Боль будзіць сярод ночы. Нейкая жылка лопнула ў воку, ад ціску, няма цудаў, каб яго паладзіць. Так, вачэй я не шкадавала! Шыла і шыла! Такую мела ахвоту, прагу шыць. А цяпер што — мярцам трэба шыць.

Падышла я была да акна са знакамітай краўчыхай, паглядзелі: пад'ехаў самаход, выйшаў чалавек, падняў чырвонае века покрыўкі студні з цудоўнай вадой. Ніна паправіла на сцяне вышываны яшчэ яе мамай ручнічок: вісеў крышку крыва. Усё ж такі, бачыць. Памаўчала. І паўспаміналіся ёй дакладныя, быццам у вачах стаялі, падзеі і людзі з ваеннага часу, імёны нават звяроў. Амаль кожны дзень, амаль кожная мясціна... І так да канца вайны, калі яны апынуліся паміж двух агнёў, паміж айчынамі-неайчынамі, да вандроўкі дадому. У Рыбакі. Памятала кожную мінуту.

— Даходжу да ракі. А мне ўжо ў вачах мроіцца, што гэта не Лука, а быццам цягнік імчыцца! Іду, бачу сваю вёску. Цэлая. А мне мой вузялок абсунуўся з плячэй... А тут Нарва поўнасцю разлітая, нават да моста не дайсці...

Мінаючы хатку і студню слаўнай краўчыхі Ніны Хлябіч, мне ў вачах будзе стаяць яе стомлены ды жыццярадасны твар ды гучаць голас: „Жадаю, каб добры Бог даў шчасце і здароўе старэчам і маладым. І каб больш вайны не было...”

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Юбілей царквы ў Седльцах

(аб)

У Свята-Троіцкай царкве ў Седльцах 23 мая адзначалася 20-годдзе асвячэння храма. Урачыстую літургію з гэтай нагоды здзейсніў айцец мітрат Вікенцій Пугацэвіч з Белай-Падляшскай у прысутнасці вернікаў і запрошаных гасцей. Настаяцель прыхода протаіерей Славамір Кохан, спасылаючыся на гадавіну, адзначыў вялікае значэнне веры і выцякаючай з яе сілы. Найлепшым гэтаму прыкладам з'яўляецца храм у Седльцах. Мясцовыя вернікі з 1915 года былі пазбаўлены пастаяннага месца малітвы. З таго часу ўсе сядлецкія храмы знаходзіліся ў часовых памяшканнях. Невялікая праваслаўная супольнасць, якая налічвала каля 150 чалавек, давяла аднак да ўзвядзення і храма, і прыхадскога дома. Здзейснілі яны тое, што многім здавалася быць нерэальным. Іх вера пераадолела ўсе перашкоды.

Намеснік старшыні Рады горада Седльцы д-р Адам Бобрык ад імя самаўрада павіншаваў праваслаўную супольнасць з юбілеем. Адзначыў ён значэнне праваслаўя ў абагачэнні горада і развіцці шматкультурнасці мясцовага асяроддзя. Прыгадаў ён вялікія заслугі айца мітрата Барыса Дыканца, які, трымаючы дружалюбныя адносіны з гарадскімі ўладамі, інтэграваў праваслаўную супольнасць, імкнуўся прыйсці да пагаднення з вернікамі Каталіцкага касцёла і давёў да ўзвядзення храма, які з'яўляецца сімвалам прысутнасці ўсходняга абраду ў Седльцах. Гэты храм дае вернікам не толькі магчымасць памаліцца, але таксама набліжае жыхарам горада духовасць праваслаўя. Гэта аблягчае экуменічны дыялог і прыбліжае нашы культуры, — адзначыў д-р Адам Бобрык.

Фота Альжбеты ПАГРАБНЯК

Айца Славаміра Кохана віншуюць намеснік старшыні Рады горада Седльцы д-р Адам Бобрык і радная Анна Сахацкая

Адгаданка

	1	2			3						
							4				5
								6			
	7		8			9		10	11	12	
	13										14
				15		16					

1. старажытная гліняная пасудзіна з дзвюма ручкамі і вузкім горлам, 2. гарыць у свечцы, 3. запаленне мандалін, 4. электронная лямпа з трома электродамі, 5. тысяча тысяч, 6. тонкі, плоскі кавалак, напрыклад, паперы, 7. цвёрды сплаў жалеза з вуглярод ам, 8. архітэктурны стыль канца XVIII — пачатку XIX стагоддзяў, заснаваны на імітацыі антычных узораў, 9. адлюстраванне мастацкімі сродкамі вонкавай рэчаіснасці, 10. першая жонка Якава, 11. біблейскі пакутнік, 12. пара сеяння, 13. бурштын, 14. установа з міністрамі, 15. кіслы цытрусавы плод, 16. партнёр свінаркі.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — афарызм Станіслава Леца.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 19 нумара

Бак, дапаўненне, заліў, ікона, кава, Ліда, мыла, цуд.

Рашэнне: **О, разумная галава, чараўніца зялёнага луга, твая зрудзелая трава пад маім буйнее плугам.**

Кніжную ўзнагароду высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk”, Białystok.
Тэкстаў не замоўленых рэдакцыя не зварацае.
Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH” i „KOLPORTER” na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130,5 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy” w 2010 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 6,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,90 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa”,
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 250 egz.

Простыя дадаткі да агіяграфіі бласлаўлёнага Папялушкі

Фота і тэкст Ганны КАНДРАЦЮК

Калі разам са жменькай вяскоўцаў мы стаялі ля каплічкі з белага газабетону „сіпорэкс” і слухалі як вяскоўцы моляцца за ўраджай палёў і ніў, у альшыне над рэчкай расшчабяталіся салаўі. Голас маткі-прыроды ў месцы, якое спарадзіла Касцёлу бласлаўлёнага, прамовіў на падляшска-народны спосаб. Карацей, ён прадказваў сустрэчу з нечым страсна-прыгожым. Гэта часткова супакоіла хваляванні, якія цягнуліся следам нашай вандроўкі ў Сухаволю і Акопы. У медыях радзіма Ежы Папялушкі — сімвал і ўзор той польскасці, якая палохае нават беларусаў-каталікоў ад Бабруйска. Пасля, калі на месцы мы сустрэнем такіх жа разгубленых і адначасова шчырых і адкрытых людзей, мы без слоў зразумеем сваю роднасць. І прысутнасць бласлаўлёнага, які паспрыяе нам запісаць арыгінальныя ўспаміны на беларускай гаворцы, якую тут завуць папросту *простай!*

* * *

Перад ад’ездам у краіну ксяндза Ежы Папялушкі, як у апошні час сталі называць усю Сухавольскую гміну (у мінулым: Сухая Ятвезь) нас павучылі добрыя людзі з Беластока:

— Найлепш то скажыце, што вы палякі з Гродзеншчыны...

— Дзеля якой мэты?

— Дзеля такой, каб яны захацелі з вамі пагутарыць...

Праз момант мы адчулі сябе як пасланцы ў варожы край, з улікам, што наша дарога можа атрымацца толькі ў адзін бок. Эмоцыі падбівалі гістарычныя цікавіны, канкрэтна, што завітаем да нашчадкаў ваяўнічых яцвягаў. Паводле старажытных летапісаў гэты вымерлы народ не няньчыўся з падазронымі прыблудамі і ўсякай масці прапаведнікамі. Праўда, я сама толькі прыкідвалася першапраходцам па яцвяжскай сцежцы. Пах яцвяга адчуваю на два кіламетры. Аднак да паездкі ў Акопы я не звяртала ўвагі на каменны круг вакол цудадзейнай магілы Ежы Папялушкі ў Варшаве. Мне чамусьці не прыходзіла ў голаў, што польскі бласлаўлёны можа мець дачыненні з яцвяжска-скандынаўскім народам. Больш за ўсё балеў адзін недахоп. Польская легенда пра ксяндза-пакутніка як агню пазбягае звесткі, што ў маленстве і ў сямейным крузе бласлаўлёны размаўляў на беларускай гаворцы, называнай па ўсёй Сакольшчыне і Беласточчыне простай мовай. У гэтым месцы нас таксама асцерагалі добрыя людзі. Яны ўспомнілі пра непрыемнасці, якія сустрэлі пісьменніка і перакладчыка беларускай і рускай літаратур Віктара Варашыльскага, які як адзіны паляк напісаў пра сувязь Ежы Папялушкі з беларускім словам.

— Палякі не любяць гэтых простых дадаткаў! — асцерагалі нас тыя ж знаёмыя.

Паколькі апошнім часам у Польшчы безупынна перакоўваюць зло ды няшчасце ў дабро і шчасце — праўда, пакуль у тэорыі — мы таксама рашылі перакаваць непрыхільнасць і нялюбасць у любасць ды прыхільнасць. Карацей, мы пайшлі за словамі Ежы Папялушкі, які вучыў, каб усякае зло перамагаць дабром.

* * *

Едучы ў Акопы, я не спадзявалася, што пачую там жывую беларускую мову, а сама задума, каб прыкідвацца палякам з Беларусі паказалася хітра-дурной. У першую чаргу цікавіла як успрымуць жыхары краіны ксяндза Ежы Папялушкі нечаканы візіт беларускамоўных медыяў. У Акопы мы трапілі ў Градавую сераду, у дзень, як скажуць вяскоўцы, калі не *гаруць і не сеюць*. Як істотная апошняя акалічнасць мы даведаемся ад ся’мі бласлаўлёнага, калі будзем дамаўляцца на чарговы візіт. Нас запросяць у свята, калі ў полі не будзе работы і будзе час на размовы.

Але да таго шчаслівага моманту мы будзем вымушаны пераадолець шмат перашкод, якія вырастуць на дарозе...

Адразу пасля прыезду ў Акопы мы шчасліва трапілі на вясковы малебен ля каплічкі. У цэнтры грамадкі прыкмецілі спадарыню Марыянну Папялушку ў характэрнай хустцы на галаве. Бабулька з задуменным абліччам сядзела на лавачцы. У апошнім радку выстойвалі мужчыны, між іншым, Станіслаў Папялушка, родны брат бласлаўлёнага і братанак ксяндза — Ежы Павел Папялушка. У тым часе нас уразіла адна справа-з’ява. У час малебна праз вёску стралой праляцелі два аўтобусы з турыстамі. Мы не маглі зразумець чаму наведвальнікі, якія перліся сюды з другога канца Польшчы, не спыніліся ля роднага дома бласлаўлёнага. Хоць бы на тое, каб пстрыкнуць сабе памятны здымак. Ці не кіраваліся яны мегапапулярнай кніжыцай пад загалоўкам *Błagosłowiony ks. Jerzy Popiełuszko* (выдавецтва: Fakt, 2010 г.), дзе аўтарка літаральна пасылае наведвальнікаў пад дурнога хату. Карацей, яна піша што шэры домік Папялушкаў нічым не вылучаецца сярод іншых...

Дом Папялушкаў у Акопах

Малебен у Градавую сераду

У Акопах мы пабачылі якраз адваротнае. Дом славутай сямейкі — на дзве палавіны, двухпавярховы, з натуральнай цэглы, крыты бляхай. На другім баку вуліцы стаіць не менш адметная каплічка з белага „сіпорэксу” і мемарыяльны камень, прыаздоблены між іншым ваяўнічай цытатай: „Nie wolno milczeć! Ks. Jerzy...”

У адміраючых Акопах такія дэталі кідаюцца ў вочы. Нас натхніла іншая сцэна. Пасля малебна мясцовы народ пазбіраўся ў кучкі каб пагаманіць. Тое, што з боку выстойвалі нейкія чужынцы, не мела тут значэння. Вяскоўцы не звярталі на нас увагі і гаманілі сабе на сваёй простай мове. Іх незалежны спосаб быцця дадаваў нам упэўненасці на небяспечна-яцвяжскай сцежцы...

(працяг будзе)

13.06 — 19.06

(22.03. — 20.04.) Поспехі ў кампанейскім і прафесійным плане — 13-17.06. Будзеш у знакамітай форме, а шмат мараў здзейсніцца якраз цяпер. І то ў такі спосаб, што ўсе будуць пад уражаннем тваіх поспехаў. Пачуццё, што тое, чаму аддаеш свай час і сэрца, мае сэнс і давядзе туды, дзе ты заўжды хацеў быць.

(21.04. — 21.05.) Знакамітая інтуіцыя паможа зрабіць табе толькі тое, што прынясе табе поспех. Будуць пабуджаны твае ўява і мастацкія здольнасці. 13-14.06. вельмі актыўна паўздзейнічаеш на ход спраў. 15-19.06. можаш моцна абяссілець ад унутранага змагання з самім сабой.

(22.05. — 22.06.) Выкарыстай усе шанцы, якія паявяцца на пачатку тыдня. Новыя кантакты, кемлівасць і шустрасць. Пільнуйся асоб, якія не стрымліваюць слова. На працы гарачы час. Не ўпусці моманту — не спачывай на лаўрах, калі цябе нават будуць хваліць.

(23.06. — 23.07.) 13-17.06. прадбачваецца шэраг удачлівых выпадкаў. Удасца табе аформіць пару важных спраў — будзеш упэўнены ў сваіх вырашэннях. Вельмі добра будзеш адчуваць так сярод сяброў, як і новапазнаных асоб. Знакамітая фізічная форма (увесь чэрвень); дбай аб сябе; калі плануеш сур’ёзныя медычныя працэдуры, не адкладвай іх на пазней.

(24.07. — 23.08.) Усё пачне змяняцца з 14.06. Нейкая застарэлая справа патрабуе канчатковага вырашэння, размовы, абмеркавання. Чым хутчэй з ёю справішся, тым лепш. Венера прынясе гармонію ў парах, а адзінокі Леў ачаруе таго, каго захоча; вялікія эмоцыі. З грашыма няблага, ды не расходуй больш чым зарабляеш.

(24.08. — 23.09.) Упарадкуеш балаган, які перашкаджаў табе ў жыцці. Пасля перыяду застою будзеш сыпаць ідэямі, а нецярплівасць пойдзе ў гэты раз табе ў карысць. Міла ў сям’і, багата і весела ў кампаніі. Пільнуйся за рулём, асабліва калі ты нарадзіўся перад 5 верасня.

(24.09. — 23.10.) 13-14.06. знакамітыя лады з кіраўніцтвам. Вельмі ўдалая сярэдзіна чэрвеня! Фантыстычныя сустрэчы, казачныя сюрпрызы. Ажыўленае і вельмі мілае кампанейскае жыццё. На жаль, 15-19.06. выдаткі не дазволяць купіць табе тое, што вельмі хочаш!

(24.10. — 22.11.) Выдатны час на пажарожжы (увесь месяц!). Знакаміта і з грашыма. Хопіць задум на добры бізнес! Засяродзься на знаёмствах з новымі людзьмі. 13-17.06. — мноства энергіі і сілы; ты здольны да высілку волата! У другой палове месяца — аж стомішся ад кругавароту падзей; старайся не вырашаць важных спраў.

(23.11. — 22.12.) Незвычайны кампанейскі поспех. Можаш закахацца або шмат каму завярнуць у галаве! Не мусіш турбавацца, аглядацца за сябе. Добрыя задумы і кемлівасць — твае козыры. Дакажаш усім, што ты не горшы ад тых, якім здаецца, што яны лепшыя за цябе.

(23.12. — 20.01.) 13-14.06. — можаш сустрэць адпаведную асобу. Не спрачайся з асобамі, якія стаяць над табою. З запалам і адвагай бярыся за новыя праекты. Пры табе іншыя будуць адчуваць сябе добра і бяспечна. Не занядбай сваіх прафесійных спраў; адразу патаўсцее твой кашалёк!

(21.01. — 19.02.) Будзеш падабацца ўсім. Будзеш знакамітым медыятарам. Хоць сам не вельмі добра будзеш дастасоўвацца да атачэння. Бярыся за справы, на якіх табе найбольш залежыць. Імпэт да дзеяння і агромны запал, але не будзеш мець часу на адпачынак! Еж садавіну.

(20.02. — 21.03.) Нянудна і паспяхова ў сям’і і сярод сяброў. З 18.06. (да 22.06.) развівай свае таленты; нішто табе не перашкодзіць. Сюрпрызы (мілыя) ад лёсу.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960